Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ВЕРАСНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 188 (28298)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Малады старажытны Слуцк

СТАР. 7

У Англіі раздалі «шнобеляў»

СТАР. 12

Сын Якуба Коласа: і фізік, і лірык

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір УЛАХОВІЧ, старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты:

«Просты гандаль у адносінах Беларусі і Кітая — гэта тая тэма, якая паступова будзе адыходзіць на другі план на фоне прамысловай каапэрацыі, доступу да фінансавых рэсурсаў, інвестыцый, дзелавой адукацыі, сумесных выставак. Ёсць вельмі шырокае поле для нашага ўзаемадзеяння. Інвестыцыі сёння — гэта не толькі тыя крэдытныя рэсурсы, якія ідуць па лініі дзяржавы. Мы бачым, што фонды, прыватныя інвестары сёння гатовы разглядаць Беларусь як вельмі надзейнага, важнага і даверанага партнёра».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.09.2016 г.

Долар ЗША	1,9330	▲
Еўра	2,1636	▼
Рас. руб.	0,0302	■
Укр. грыўня	0,0746	▼

ISSN 1990 - 763X

Вітанне бабінага лета

Мінск, апошнія дні верасня, Купалаўскі парк.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Глыбінка

«СТАБАЛЬНІКІ» З ВЯСКОВАЙ ШКОЛЫ

Сёлетнія выпускнікі Правамастоўскай сярэдняй школы Вольга САМАРДАК і Максім СЦЕМПЛЕЎСКІ (на фота) ўпершыню ў гісторыі гэтай навучальнай установы атрымалі 100-бальныя сертыфікаты на цэнтралізаваным тэсціраванні. Такі вынік, ды яшчэ «дуплетам», для звычайнай вясковай школы — падзея сапраўды неардынарная, ледзь не сенсацыя. Аказваецца, і ў глыбінцы можна дабівацца выдатных поспехаў, прычым, зусім не абавязкова пры дапамозе рэпетытараў.

Максім закончыў школу з залатым медалём, сярэдні бал атэстата — 10. На цэнтралізаваным тэсціраванні ён атрымаў 100-бальны сертыфікат па рускай мове. А як пераможца заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды атрымаў яшчэ 100 балаў па грамадазнаўстве. Яго мама, **намеснік дырэктара Правамастоўскай сярэдняй школы па вучэбнай рабоце Вольга СЦЕМПЛЕЎСКАЯ,** лічыць гэтыя вынікі сумеснай заслугай сына і педагогаў.

СТАР. 4

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Ініцыятыва

«Прапануйце свае ідэі, а не скардзіцеся, што ўсё дрэнна»

Кіраўнік конкурсу сацыяльных праектаў — пра іх фінансаванне і канкурэнцыю паміж грамадскімі арганізацыямі

Чаму бізнес не заўсёды дае грошы на дабрачыннасць? Ці можна зрабіць сацыяльны праект самаакупным? І якіх ідэй нам не хапае? Пра гэта мы пагутарылі з кіраўніком рэспубліканскага конкурсу сацыяльных праектаў Social Weekend Аляксандрам СКРАБОЎСКІМ. Конкурс праводзіцца ў Беларусі ўжо восьмы раз і дае магчымасць любому ахвотнаму прапанаваць ідэю, карысную для грамадства, і атрымаць фінансавую дапамогу на яе рэалізацыю. Агульны прызавы фонд гэтым разам — каля 40 тысяч рублёў.

— Аляксандр, вы прыйшлі ў сацыяльную сферу з бізнесу. Чаму тры гады таму вырашылі пакінуць прадпрымальніцтва?

— Я 12 гадоў займаўся абсалютна рознымі праектамі: і інфармацыйныя тэхналогіі, і фінансы, і будаўніцтва. А потым быў перыяд нейкага пошуку. Якраз у той час праходзіў першы Social Weekend, і я вырашыў далучыцца да арганізацыі конкурсу. Заўсёды было цікава прыўнесці прафесійнае кіраванне ў сацыяльную сферу. Бо бачыў, што бізнес і сацыяльны бок не заўсёды разумеюць адзін аднаго.

СТАР. 5

ПРЭЗІДЭНТ ПРЫБЫЎ У КІТАЙ

Учора ўвечары Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з дзяржаўным візітам у Кітайскую Народную Рэспубліку. Самалёт кіраўніка беларускай дзяржавы зрабіў пасадку ў пекінскім аэрапорце Шоуду, паведамляе БЕЛТА.

Напярэдадні прыезду Аляксандра Лукашэнкі ў сталіцу КНР прыбыла прадстаўнічая беларуская дэлегацыя ў складзе членаў урада, кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў, дырэктараў буйных прамысловых прадпрыемстваў. У іх ужо адбыўся цэлы шэраг плённых рабочых сустрэч і перамоваў з кітайскімі партнёрамі.

У прыватнасці, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Мікалай Снапкоў сустрэўся з членам Палітбюро ЦК КПК, сакратаром палітыка-юрыдычнай камісіі ЦК КПК, старшынёй Кітайска-беларускага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве Мэн Цзяньчжу.

На сустрэчы Мэн Цзяньчжу адзначыў, што візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай па запрашэнні Старшыні КНР Сі Цзіньпіна стане важнай падзеяй у кітайска-беларускіх дружалюбных адносінах. Кітайскі бок упэўнены, што візіт беларускага лідара надасць новы імпульс развіццю адносін дзвюх краін.

Мікалай Снапкоў, у сваю чаргу, запэўніў, што беларускі бок гатовы працаваць разам з Кітаем для прасоўвання развіцця адносін дзвюх краін.

■ Сацыяльны клопат

На што разлічваць сучаснаму пенсіянеру

Кожны чацвёрты беларус дасягнуў узросту, які перавышае працаздольны, а кожнаму сёмаму — больш за 65 гадоў. Апошніх у нас — 14,4%. Пры гэтым, згодна з міжнароднымі крытэрыямі геранталогіі, насельніцтва лічыцца старым, калі асоб ад 65 гадоў у краіне 7%. Пажылыя суайчыннікі лічаць за лепшае жыць у звыклых дамашніх умовах і карыстацца сацыяльнай дапамогай дома і разавымі паслугамі.

— Павелічэнне колькасці пажылых людзей — тэндэнцыя не толькі Беларусі, але і іншых еўрапейскіх краін, — зазначыў **Аляксандр РУМАК, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі.** — Гэта мае вынікам рашэнне пэўных задач. Перш за ўсё, падтрымку актыўнай жыццёвай пазіцыі і развіццё сацыяльных паслуг для пажылых грамадзян, каб яны захоўвалі магчымасць самастойна абслугоўваць сябе. Калі ім спатрэбіцца пабочная дапамога, да іх прыйдзе увесь комплекс паслуг, што развіты ў краіне.

Самай запатрабаванай паслугай у насельніцтва застаецца сацыяльная дапамога дома, якой карыстаецца амаль 89 тыс. пажылых, 44,1% з якіх — асобы ад 80 гадоў і старэйшыя. Разавыя паслугі, якія не ўваходзяць у шэраг абавязковых, таксама папулярныя. Сёлета 65 тыс. грамадзян скарысталіся такой магчымасцю — было аказана 170 тыс. платных разавых паслуг. Тарыфы на іх застаюцца на ўзроўні мінулага года — ад 35 да 50 капеек за нормагадзіну для адзінокіх грамадзян. Тыя, хто мае дзяцей, заплацяць за разавыя паслугі ў поўным памеры. Адзінокія і з невысокім узроўнем даходу вызваляюцца ад аплаты.

Захавалася ў Беларусі і сістэма санаторна-курортнага аздараўлення. Пажылыя людзі ў залежнасці ад памеру пенсіі могуць заплаціць за пуцёўку 15—20% ад рэальнага яе кошту.

— Якія б добрыя ні былі створаны ўмовы ва ўстановах стацыянарнага знаходжання, людзям лепш жыць у сваім звыклым асяроддзі. Таму, прапануючы чалавеку дапамогу, трэба ўлічваць яго жаданні і нічога не навязваць. Магчымасць выбару ёсць заўсёды. Для таго і развіваюцца новыя формы сацыяльнага абслугоўвання, напрыклад, тыя ж дамы самастойнага сумеснага пражывання, — расказаў прадстаўнік міністэрства. — Стаіць задача не развіваць сетку вялікіх дамоў-інтэрнатаў. Той колькасці, што існуе, дастаткова цяпер. Лепш развіваць так званыя малыя формы сацыяльнага абслугоўвання, якія набліжаны да месцаў пражывання пажылых.

Дарэчы

Нестацыянарнае сацыяльнае абслугоўванне аказваецца ў 146 тэрытарыяльных цэнтрах, дзе атрымліваюць дапамогу 1,8 млн пенсіянераў, 128,8 тыс. з якіх — адзінокія, а 581,5 тыс. — жывуць адны.

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Дзясятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю работу 3 кастрычніка 2016 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 3 кастрычніка 2016 года з 9.15 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

Да ведама членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

3 кастрычніка (10.00), 6 кастрычіка (14.00) і 7 кастрычніка (16.00) 2016 г. у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудуцца пасяджэнні дванаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Інтэграцыя

ДЗЕЛЯ АГУЛЬНАГА ДАБРАБЫТУ

У сталіцы абмяркоўваюць здабыткі і перспектывы СНД

Крыху больш, чым праз два месяцы Садружнасць Незалежных Дзяржаў адзначыць свой 25-гадовы юбілей. Увесь бягучы год у арганізацыі аб'яўлены юбілейным, і ўчора адбылася адна з самых знакавых святочных падзей — у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адкрылася канферэнцыя «25 гадоў Садружнасці Незалежных Дзяржаў: вынікі, перспектывы». У мерапрыемстве прынялі ўдзел больш за 200 прадстаўнікоў ад усіх краін аб'яднання. Падчас пленарнага пасяджэння ўдзельнікам канферэнцыі зачыталі прывітальныя словы ад трох прэзідэнтаў — Беларусі, Кыргызстана, які, дарэчы, зараз старшынствуе ў СНД, і Расіі, якая стане старшынёй у наступным годзе.

ВАЖНАСЦЬ — СТРАТЭГІЧНАЯ

Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, зачытаў удзельнікам канферэнцыі прывітанне лідара нашай краіны: «Сёння, калі свет увайшоў у паласу эканамічных і палітычных трансфармацый, нарастаючай дынамікі прагрэсу ў навуцы і змены тэхналагічных укладаў, Садружнасць выступае эфектыўнай пляцоўкай для дыялогу і вырашэння многіх міждзяржаўных праблем. У гэтых умовах магістральнымі шляхамі развіцця СНД становяцца ўзаемавыгаднае партнёрства, прамысловая кааперацыя і гуманітарнае супрацоўніцтва».

Ад свайго імя Ігар Бузоўскі падзякаваў прысутным за ўдзел у канферэнцыі і за тую работу, якую робяць яны для дабрабыту дзяржаў — удзельніц аб'яднання.

— Гэта не проста нейкая вузкаведамасная работа, гэта не проста вузкаведамасная канферэнцыя, — заўважыў ён. — Гэта канферэнцыя, якая прызваная, магчыма, стратэгічна вызначыць нейкія пытанні ў развіцці нашых дзяржаў.

У АСНОВЕ — ЭКАНОМІКА

Пра значнасць канферэнцыі гаворыць і тое, што ўдзел у ёй прыняў **Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр нашай краіны.**

— Пазіцыя Беларусі заўсёды была паслядоўная і адкрытая: СНД з'яўляецца значным, запатрабаваным і актуальным міждзяржаўным аб'яднаннем, якое дазваляе яго ўдзельнікам вырашаць увесь спектр надзённых пытанняў міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, — адзначыў ён у сваім выступленні.

Паводле слоў Андрэя Кабякова, менавіта гэты пасыл Беларусь прапануе закладваць у аснову работы па далейшым удасканаленні функцыянавання СНД. Кіраўнік урада нагадаў, што праз месяц Мінск зноў стане сталіцай інтэграцыйных падзей — пройдзе пасяджэнне савета кіраўнікоў урадаў.

РАЎНАПРАЎНЫЯ СТАСУНКІ З ЗАХАДАМ І ЎСХОДАМ

Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ, старшыня Выканаўчага камітэта СНД, выказаў думку, што калі б краіны Садружнасці не дзейнічалі разам, негатыўныя ўплывы сусветнай эканомікі адчуваліся б мацней.

— І зараз мы бачым, што негатыўныя наступствы крызісу, фінансавых праблем сусветнай эканомікі для нас аказаліся меншымі, чым, напрыклад, у 2008—2009 гадах, калі ў нас такога плану сумесных дзеянняў не было, — аргументаваў старшыня Выканкама СНД. — Вядома, ёсць цяжкасці, абумоўленыя глабальным крызісам, санкцыйнай палітыкай Захаду, але гэтыя цяжкасці пераадольваюцца, і, што характэрна, на маючым адбыцца пасяджэнні кіраўнікоў урадаў у Мінску 28 кастрычніка будзе заслухана пытанне, як рэалізуецца план сумесных мерапрыемстваў па пераадоленні гэтых негатыўных наступстваў.

У гутарцы з журналістамі Сяргей Лебедзеў падкрэсліў, што ўсе краіны Садружнасці заўсёды былі настроены на пабудову ўзаемавыгадных канструктыўных адносін як з заходнімі, так і з усходнімі партнёрамі. Так, Кітайская Народная Рэспубліка — надзейны партнёр усіх краін Садружнасці.

— Мы разглядаем супрацоўніцтва з КНР як раўнапраўнае, узаемавыгаднае, — сказаў кіраўнік Выканкама СНД. — Думаю, доказ гэтаму — візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Кітайскую Народную Рэспубліку.

ФУНДАМЕНТ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ

Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі нашай краіны, гаворачы пра інфармацыйнае ўзаемадзеянне ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў, падкрэсліла, што наша дзяржава заўсёды была прыхільніцай інтэграцыйных працэсаў на еўразійскай прасторы.

— Безумоўна, супрацоўніцтва ў рамках СНД у розных сферах — гэта аснова развіцця нашых краін, той базіс, на які павінны абапірацца эканамічныя, палітычныя працэсы, — сказала міністр. — Адзін з найважнейшых кірункаў — гуманітарнае супрацоўніцтва і яго неад'емная частка — інфармацыйны складнік. Імклівае развіццё інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій ператварылі медыяасяроддзе ў сістэмастваральны фактар жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы. Мы проста абавязаны выкарыстоўваць гэты фактар, яго магутны пазітыўны патэнцыял на карысць нашага агульнага развіцця.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Пазіцыя

Прыярытэт — сацпадтрымка людзей

У пераўтварэннях, якія абмяркоўваюцца, Беларусь мае намер аддаваць прыярытэт сацпадтрымцы насельніцтва, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў на сустрэчы з прадстаўнікамі місіі Міжнароднага валютнага фонду на чале з кіраўніком місіі ў Беларусі Пітэрам Долманам, паведамляе БЕЛТА.

«Беларусь мае намер аддаваць прыярытэт сацыяльнай падтрымцы насельніцтва, асцярожна і ўзважана праводзіць эканамічную палітыку», — адзначыў Андрэй Кабякоў, гаворачы аб пераўтварэннях, што абмяркоўваюцца з МВФ.

Кіраўнік урада таксама звярнуў увагу, што адна з найбольш адчувальных тэм — павышэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі — увязваецца з павышэннем эфектыўнасці ўсёй сістэмы ЖКГ і энергетыкі.

У сваю чаргу, кіраўнік місіі МВФ па Беларусі Пітэр Долман агучыў папярэднія вынікі работы місіі

■ Нацыянальны каларыт

Ці станем мы «славянскай Італіяй»?

Аграэкатурызм у нашай краіне афіцыйна пачаў сваё развіцце яшчэ ў 2002 годзе. З таго часу ў Беларусі ўзнікла ўжо больш за 2 тысячы турыстычных сядзіб. Фарміруюцца турыстычныя кластары са сваёй унікальнай спецыфікай і нацыянальным каларытам. Старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА падчас анлайн-канферэнцыі на партале Саюзнай дзяржавы адзначыла, што, нягледзячы на негатыўныя эканамічныя з'явы, аграэкатурызм знаходзіцца ў пастаянным прыросце. Пры гэтым у згаданай сферы засталося яшчэ шмат задум, якія нашай краіне можна і трэба рэалізаваць, бо для гэтага сёння ёсць усе ўмовы.

НЕ КАНКУРЫРАВАЦЬ, А КААПЕРАВАЦЦА

Па словах Валерыі Кліцуновай, за 14 гадоў існавання аграэкатурызму, многія прадстаўнікі сферы ўсё яшчэ працуюць над новымі нацыянальнымі прадуктамі і кірункамі, якія б прыкметна вылучалі нас на фоне суседзяў. «Актыўна работа вядзецца і над стварэннем беларускага варыянта сельскага турызму. Прычым упор цяпер робіцца не на канкурэнцыю паміж суб'ектамі гаспадарання, а на кааперацыю. Многія разумеюць, што сёння важна аб'ядноўвацца пад адным брэндам і выпрацоўваць свой унікальны для пэўнага рэгіёна прадукт», — патлумачыла Валерыя Кліцунова. У абстаноўцы ідэйнай кааперацыі, а аграэкатурызм — гэта, перш за ўсё, зона свабодных ініцыятыў і крэатыву, ствараюцца і «зялёныя маршруты» і ўнікальныя турпрадукты.

ГАЛОЎНАЕ — ЗАХАВАЦЬ ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ

Паспяховасць сферы аграэкатурызму вымяраецца колькасцю суб'ектаў гаспадарання, якія прыходзяць на гэты рынак. Але ў гэтым хаваецца і праблема, лічыць Валерыя Кліцунова.

«Ёсць рызыка, што новыя ўдзельнікі рынку могуць аказваць няякасныя паслугі. Мы ведаем, што такія рызыкі мінімальныя, але ў эпоху інтэрнэту хібы становяцца здабыткам грамадскасці, што кідае цень на ўсю галіну», — заўважыла кіраўнік аб'яднання.

Але не гэта больш за ўсё турбуе прадстаўнікоў сферы. Адна з найважнейшых праблем — захаваць існуючыя правілы гульні, якія ствараюць спрыяльныя ўмовы для развіцця турызму ў краіне. «Наш галоўны дакумент — гэта Указ Прэзідэнта №372 «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь». Дакумент выдатны. Я не ведаю ні адной краіны, дзе быў бы такі ж. Дзякуючы яму ў вёску сталі інвеставаць грошы. Гэта пачаў рабіць і буйны бізнес», — адзначыла Валерыя Кліцунова.

Указ павінен дзейнічаць да 2021 года і мае на ўвазе нязменныя правілы гульні на гэты перыяд. Аднак дакумент часам спрабуюць падвяргаць рэвізіі. Пакуль беспаспяхова. Але гэта турбуе ўдзельнікаў рынку айчыннага турызму.

«Правілы гульні мяняць не трэба таму, што гэта нявыгадна для ўсіх. Аналізуючы рынак турызму падчас эканамічнага крызісу, мы бачым, што спад адбываецца ўсюды акрамя сферы аграэкатурызму. Тут наадварот назіраецца пастаянны рост. Момант крызісу нашы людзі выкарыстоўваюць як магчымасць прыдумляць новыя прадукты, якія ствараюцца не за кошт інвестыцый, а за кошт творчасці», — расказала старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы».

Па словах Валерыі Кліцуновай, у Еўропе асноўным арыенцірам для сельскага турызму з'яўляецца Італія. Беларусь магла б стаць «славянскай Італіяй». І для гэтага ў нас ёсць усе перадумовы: прыродны і экалагічны патэнцыял, унікальныя традыцыі, беларуская вёска.

«Мы малавядомыя для еўрапейцаў, а невядомае вабіць. Гастранамічны і экатурызм — гэта нашы асноўныя кірункі, па якіх мы зможам заявіць пра сябе», — падсумавала гутарку Валерыя Кліцунова.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Фінансы

ФУТБОЛ ДЛЯ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

Асацыяцыя беларускіх банкаў і кампанія Visa прадставілі ў Мінску адукацыйную відэагульню «Фінансавы футбол 2.0» (падрабязна пра яе «Звязда» пісала ў нумары за 27 верасня), якая з'яўляецца абноўленай лакалізаванай версіяй займальнай камп'ютарнай гульні для атрымання фінансавых ведаў.

Фота БЕЛТА.

Рэгіянальны менеджар кампаніі Visa ў Беларусі, Малдове і Азербайджане Ігар КАВАЛЁЎ уручае кнігу і дыск з гульнёй намесніку старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Сяргею КАЛЕЧЫЦУ.

Як падкрэсліў падчас прэзентацыі **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Сяргей КАЛЕЧЫЦ,** фінансавая адукаванасць з'яўляецца адным з найбольш важных кірункаў дзейнасці Нацбанка. «З кампаніяй Visa мы супрацоўнічаем з 2013 года, і за гэты час ужо зроблена вялікая работа: адаптавана да беларускіх рэалій гульня «Фінансавы футбол», праведзена першае ў краіне даследаванне фінансавай адукаванасці насельніцтва, выпушчаны брашуры і падручнікі на гэтую тэму», — удакладніў намеснік старшыні.

Рэгіянальны менеджар Visa ў Беларусі, Малдове і Азербайджане Ігар КАВАЛЁЎ адзначыў, што кампанія займаецца распрацоўкай праграм, якія накіраваны на павышэнне фінансавай адукаванасці, ужо больш за дзесяць гадоў. «Фінансавыя веды даюць магчымасць навучыцца выбудоўваць асабісты бюджэт, кантраляваць свае выдаткі і зберажэнні. А павышэнне фінансавай адукаванасці спрыяе росту дабрабыту людзей і эканамічнаму развіццю грамадства», — паведаміў ён.

Асацыяцыя беларускіх банкаў і кампанія Visa таксама плануюць правядзенне сумесных публічных лекцый ва ўніверсітэтах, выданне практычнага дапаможніка па кіраванні асабістымі фінансамі, паведаміў **намеснік старшыні Асацыяцыі беларускіх банкаў Аляксандр КУЧЫНСКІ.**

Дарэчы, гэтымі днямі спецыялісты нашага нацыянальнага банкаўскага рэгулятара і Міністэрства адукацыі Беларусі распрацоўваюць сумесны праект па павышэнні фінансавай адукаванасці ў школах, паведаміў намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Сяргей Калечыц. «Намі рыхтуецца сумесны праект з Мінадукацыі і думаю, што ён будзе вельмі карысны. Цяжка сказаць, калі ён пачне працаваць, але тое, што такая ініцыятыва будзе рэалізаваная, гэта дакладна», — адзначыў Сяргей Калечыц. Сёння спецыялістамі дзвюх структур выбіраецца фармат рэалізацыі згаданага праекта. Магчыма, гэта будзе дадатковы ўрок з невялікай колькасцю гадзін па годзе, або — на ўзроўні факультатыўных заняткаў.

Акрамя таго, намеснік старшыні праўлення Нацбанка анансаваў два буйныя мерапрыемствы ў сферы павышэння фінансавай адукаванасці, якія адбудуцца ў найбліжэйшы час. Гаворка ідзе пра спецыялізаваную выставу фінансавых паслуг «Маніфэст», якая пройдзе 27—29 кастрычніка. Таксама ў кастрычніку — снежні будзе праходзіць фінансавая алімпіяда для вучняў 10—11-х класаў», — паведаміў ён.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

Ратавальнік з трэцяга класа

Дзевяцігадовы Алёша ІВАНОЎ прадухіліў пажар у бабруйскім пяціпавярховіку па вуліцы Энергетыкаў

У мінулую суботу разам з сябрамі ён гуляў у двары свайго дома, і раптам дзеці ўбачылі, што з вокнаў і расчыненых балконных дзвярэй кватэры на першым паверсе валіць дым. «А раптам там бездапаможныя людзі?» — выказаў нехта думку ўслых. І — панеслася. Дзеці хутка пачалі біць трывогу, званіць у дзверы. Безвынікова. Тады яны папрасілі дарослага суседа паведаміць ратавальнікам пра пажар, а самі арганізавалі аперацыю па выяўленні патэнцыйных ахвяр. Нехта прынёс крэсла і трэцякласнік Алёша Іваноў смела пералез цераз парэнчы балкона. Хутка ён вярнуўся, каб паведаміць усім, што людзей у кватэры няма. А ачаг узгарання ён выявіў на кухні. Гаспадар перад тым, як сысці з кватэры, паставіў падаграваць ежу. Хлопчык выключыў пліту і вярнуўся да сяброў.

— Алёша дзейнічаў як сапраўдны прафесіянал, — не скрывае свайго захаплення ўчынкам трэцякласніка **спецыяліст групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Бабруйскага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях Уладзімір БУДКО.** — Дзіця зусім, а павёў сябе, як дарослы. Выключыў газ, перамяшчаўся па кватэры, прыгнуўшыся да падлогі. Наогул дзеці — малайцы, хутка сарыентаваліся, як дзейнічаць. Адчуваецца, што навучанне асновам паводзінаў у экстрэмальных сітуацыях у школе наладжана на высокім узроўні.

Дарэчы, Алёша Іваноў — вучань бабруйскай сярэдняй школы №10. Гэтая школа яшчэ знакамітая тым, што некалькі гадоў запар яе вучні адстойвалі гонар Магілёўскай вобласці па пажарнай бяспецы на рэспубліканскім узроўні.

Што датычыцца віноўніка перапалоху, які кінуў уключаным газ і пайшоў з дому, то яго хутка знайшлі. Ён быў п'яны да такой ступені, што заснуў каля аднаго з пад'ездаў свайго ж дома.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Развітанне

ПАМЁР ШЫМОН ПЕРЭС

Экс-прэзідэнт Ізраіля Шымон ПЕРЭС пайшоў з жыцця ва ўзросце 93 гадоў у клініцы Тэль-Авіва. Туды ён трапіў два тыдні таму з інсультам. Калі яго стан пагоршыўся, урачы запрасілі сваякоў развітацца з палітыкам.

Сёння пройдзе дзяржаўная паніхіда, а заўтра адбудзецца пахаванне.

Былы лідар Ізраіля — наш зямляк. Ён нарадзіўся ў вёсцы Вішнева Валожынскага раёна. У адзінаццаць гадоў разам з сям'ёй пераехаў у Палесціну. Вырас у Тэль-Авіве. Менавіта гэты чалавек стаяў каля вытокаў Дзяржавы Ізраіль. За час сваёй карьеры ён двойчы станавіўся прэм'ер-міністрам, узначальваў міністэрства абароны, міністэрства фінансаў, міністэрства сувязі, знешнепалітычнае ведамства, МУС і іншыя. Не забываў і пра Беларусь: на радзіму ён прыязджаў двойчы.

У нас таксама заўсёды памяталі знакамітага земляка. У 2013 годзе ў Вішневе на доме, у якім нарадзіўся Шымон Перэс, была адкрыта памятная дошка. У тым жа годзе начальнік упраўлення Афрыкі і Блізкага Усходу МЗС Беларусі Ігар Ляшчэня ўрачыста ўручыў палітыку памятнае пасведчанне, якое пацвярджае факт яго нараджэння 2 жніўня 1923 года на беларускай зямлі.

Шымон Перэс заўсёды быў прыхільнікам мірнага ўрэгулявання канфліктаў на Блізкім Усходзе. Ён першым з ізраільскіх лідараў агучыў ідэю склікання мірнай канферэнцыі па Блізкім Усходзе на Генасамблеі ААН. У 1994 годзе Шымон Перэс атрымаў Нобелеўскую прэмію міру за ўклад у мірнае ўрэгуляванне канфліктаў на Блізкім Усходзе.

Былы ізраільскі лідар паклапаціўся аб тым, каб нават пасля смерці дапамагаць людзям. Ён стаў донарам органаў. Яго лечачы ўрач расказаў, што сваякі пагадзіліся на перасадку рагавіцы пацыентам, якім патрэбна трансплантацыя.

«З глыбокім смуткам і болем успрынялі ў Рэспубліцы Беларусь паведамленне пра смерць Шымона Перэса — знакамітага палітычнага дзеяча, лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру, аднаго з сусветна вядомых прадстаўнікоў пакалення заснавальнікаў Ізраіля, якія нарадзіліся на беларускай зямлі. Добрая памяць аб ім застанецца з намі назаўсёды», — гаворыцца ў спачуванні, якое Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў Прэзідэнту Ізраіля, народу гэтай краіны, родным і блізкім Шымона Перэса.

Надзея АНІСОВІЧ

■ Май на ўвазе

Апавяшчальнікі чаднага газу стануць абавязковымі

У краіне нярэдкія выпадкі, калі чадным газам атручваюцца цэлыя сем'і. Дастаткова прыгадаць рэзанансную трагедыю ў Барысаве, якая адбылася ў студзені, калі СО забраў жыцці шасці чалавек. Тады ж на Століншчыне ўчадзела сям'я з пяці чалавек. У чэрвені ў бальніцу з гэтай нагоды патрапілі тры чалавекі ўжо на Валожыншчыне. Два апошнія выпадкі, на шчасце, абышліся без чалавечых ахвяр. Але як жа папярэдзіць такія гісторыі?

— Была створана рабочая група з прадстаўнікоў Мінэнерга, Белпалівагаза, МНС, Дзяржпрамнагляду і ЖКГ па разглядзе змяненняў у правілах карыстання газам у побыце, — паведаміў **галоўны інжынер сектара тэхінспекцыі ўпраўлення сістэм газазабеспячэння Белпалівагаза Ігар ПЕТРЫК.** — Адной з навацый стане абавязковая ўстаноўка апавяшчальнікаў чаднага газу ў тых жылых памяшканнях, дзе выкарыстоўваецца газавае абсталяванне.

Трэба адзначыць, што аўтаномны пажарны апавяшчальнік і апавяшчальнік чаднага газу — гэта не адно і тое ж. Апарат, які рэкамендуюць устанаўліваць ратаўнікі, фіксуе газы гарэння, а апавяшчальнік чаднага газу падае сігналы, калі ў памяшканні знаходзіцца СО.

Існуюць апараты і больш дасканалыя за просты апавяшчальнік. Адмысловы сігналізатар можа даваць сігнал на цэнтральны дыспетчарскі пункт ці на прыбор на газапровадзе, які спыніць падачу паліва. Але ён каштуе даволі дорага для насельніцтва. І таму яны з'явяцца на камунальна-бытавых аб'ектах.

— Апавяшчальнік чаднага газу каштуе каля 22 рублёў, — працягвае Ігар Петрык. — Хутчэй за ўсё, будзе ўстанаўлівацца за кошт гаспадароў кватэр. Мяркуецца, што новыя правілы запрацуюць яшчэ сёлета.

Адно з ключавых правілаў эксплуатацыі газавага абсталявання — гэта абавязковая вентыляцыя. Спецыялісты адзначаюць, што людзі пра гэта перыядычна забываюцца. Непакоіць іх і масавы пераход на шклопакеты: праз старыя драўляныя рамы невялікі паветраабмен адбываўся ўсё ж пастаянна.

Яшчэ адной болевай кропкай стала выкарыстанне газавых калонак у буйных гарадах. Калісьці яны здаваліся сапраўдным тэхнічным дасягненнем. Цяпер жа, у эпоху масавага цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння, здаюцца архаізмам, да таго ж небяспечным пры няправільнай эксплуатацыі.

— На жаль, поўнасцю адмовіцца ад іх выкарыстання нельга, — сцвярджае **намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыі жыллёвага фонду і вытворчых пытаннях ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Юрый КУКАШУК.** — Пры складанні праектна-каштарыснай дакументацыі на капітальны рамонт мы імкнёмся перавесці дамы на цэнтралізаваную сістэму гарачай вады, але тэхналагічна магчыма гэта не паўсюдна. Не заўсёды гэта правільна і з эканамічнага пункту гледжання. Разам з тым мы разглядаем пытанне замены газавых калонак электрычнымі воданагравальнікамі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

■ Спажывец

ЗВЯРТАЙ УВАГУ НА ДАМЕННАЕ ІМЯ

Як пазбегнуць падману пры куплі тавару ў сацсетках

У сувязі з частымі выпадкамі падману спажыўцоў, якія робяць пакупкі ў сацыяльных сетках у інтэрнэце, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю звяртае іх увагу на тое, што такі продаж незаконны.

Калі набываць тавары ў інтэрнэт-крамах, якія маюць пашырэнне зоны «.com» і да т. п., або на інтэрнэт-сайтах, дзе прадавец паказвае толькі электронную пошту ці тэлефон, потым будзе складана абараніць правы спажыўцоў, бо вызначыць суб'екта гандлю ў гэтых выпадках цяжка.

Каб пазбегнуць падману пры куплі тавараў з выкарыстаннем інтэрнэту, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю рэкамендуе звяртаць увагу на тое, што ў рэкламе тавараў, якая размяшчаецца ў сацыяльных сетках, на сайтах інтэрнэт-пляцовак павінна ўтрымлівацца гіперспасылка на зарэгістраваную суб'ектам гандлю ў Гандлёвым рэестры Рэспублікі Беларусь інтэрнэт-краму. У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, даменнае імя інтэрнэт-крамы павінна знаходзіцца ў нацыянальнай даменнай зоне, якая мае пазначэнне «.by», «.бел».

ДАВЕДКА. Інфармацыя пра зарэгістраваныя ў Гандлёвым рэестры Рэспублікі Беларусь інтэрнэт-крамы размешчана на афіцыйным сайце міністэрства www.mintorg.gov.by у рубрыцы «Гандлёвы рэестр», у падрубрыцы «Публікацыя звестак».

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

У Барысаве загінулі чацвёра мужчын

На месцы трагедыі ў лясным масіве знойдзены доказы ўжывання псіхатропаў

Упраўленнем Следчага камітэта па Мінскай вобласці ўстанаўліваюцца абставіны смерці чатырох маладых людзей, як мяркуецца, звязанай з атручваннем псіхатропнымі рэчывамі і наркатычнымі сродкамі.

Днём 18 верасня ў лясным масіве ў Барысаве мясцовым жыхаром былі знойдзены чацвёра мужчын, якія не падавалі прыкмет жыцця. Прыбыўшыя медыцынскія работнікі канстатавалі смерць дваіх маладых людзей (1981 і 1984 гадоў нараджэння). Трэці, 1980 года нараджэння, не прыходзячы ў прытомнасць, памёр у бальніцы. Чацвёрты, 1988 года нараджэння, знаходзячыся ў рэанімацыйным аддзяленні, пайшоў з жыцця ноччу. Усе мужчыны — жыхары Барысава. Па звестках следства, двое з іх былі асуджаныя і раней ужывалі наркотыкі. Падчас агляду месца здарэння следча-аператыўнай групай выяўленыя прадметы, якія сведчаць пра ўжыванне загінулымі наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Барысаўскім раённым аддзелам Следчага камітэта распачата крымінальная справа.

Усяго за 8 месяцаў бягучага года УСК па Мінскай вобласці распачата каля 700 крымінальных спраў па факце незаконнага абароту наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Да крымінальнай адказнасці прыцягнута больш за 250 чалавек.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Без тэрміну даўнасці

«ШТАЛАГ 382»: ДОКАЗЫ ЗЛАЧЫНСТВА

На месцы фашысцкага канцлагера знойдзены астанкі амаль 2,5 тысячы савецкіх салдат

Нібыта археалагічныя раскопкі разгарнуліся літаральна ў самым цэнтры Барысава. Толькі замест археолагаў работы тут вядуць пошукавікі, старанна дастаючы з зямных нетраў не гістарычныя артэфакты, а чалавечыя астанкі...

На такія знаходкі натрапілі ў аўтамабільным парку 60-га асобнага палка сувязі падчас будаўнічых работ. Вайскоўцы 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны, якія неўзабаве выехалі на месца, канстатавалі: на тэрыторыі сённяшняй воінскай часці — масавае пахаванне.

Дакументы сведчаць

Што і пацвердзілі архівы, кнігі памяці. Аказалася, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны тут знаходзіўся нямецкі лагер для савецкіх ваеннапалонных. «Шталаг 382» дзейнічаў з 1941 па 1943 год. Згодна з Актам надзвычайнай камісіі, які быў складзены ў верасні 1944 года, пасля вызвалення Барысава, на тэрыторыі лагера было знішчана і пахавана звыш 9 тысяч ваеннаслужачых Чырвонай Арміі. У некаторых крыніцах ёсць звесткі пра тое, што ў 1943 годзе тут утрымліваліся і ўдзельнікі Супраціўлення.

— Большая частка зняволеных складала працоўныя каманды, якія былі створаны для работ на прадпрыемствах горада і на торфараспрацоўках, — расказвае **камандзір 1-га спецыялізаванага пошукавага ўзвода 2-й спецыялізаванай пошукавай роты 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны старшы лейтэнант Аляксей КУЦУК**. — Кулявыя адтуліны на чалавечых касцях, чэрапы з характэрнай прыкметай удару прадметам у скроневую долю сведчаць аб тым, што ў лагеры людзей знішчалі. Але мяркуючы па паднятых астанках, гэтая частка складала невялікую колькасць ваеннапалонных. Большасць вязняў, хутчэй за ўсё, загінула ад голаду, холаду і хвароб. Вядома, што сутачная норма для ваеннапалоннага лагера складала 50 грамаў баланды з адходаў і невялікі кавалак хлеба. Распаўсюджанай з'явай было пакінуць пад адкрытым небам некалькі дзясяткаў чалавек, якія за ноч ператвараліся ў трупы.

Лагер ліквідавалі самі немцы. Яны вялі дакладны ўлік ваеннапалонных, інфармацыя аб вязнях, якія трапілі сюды на пачатку вайны, захавалася. У 1943-м, калі стала зразумелым, што, хутчэй за ўсё, перамога будзе не на іх баку, дакументацыю пачалі знішчаць. Магчыма, удасца знайсці больш-менш поўныя спісы ваеннапалонных «Шталага 382»: работа ў архівах Германіі яшчэ наперадзе.

Фота Надзеі БУЖАН.

«Допуск» да раскопак

Калі карэспандэнты «Звязды» выехалі на месца раскопак, работа салдат-пошукавікаў была ў самым разгары. На аб'екце, як называюць чарговае месца раскопак вайскоўцы, задзейнічана 15 чалавек. Большасць з іх — салдаты тэрміновай службы.

Вайскоўцы працуюць у спецыяльным адзенні, якое штодзень дэзынфіцыруецца, у пальчатках. Каб пазбегнуць пападання інфекцый у дыхальныя шляхі, на твары — марлевая павязка. Аказваецца, што некаторыя бактэрыі здольныя захоўвацца ў зямлі дзясяткі, нават сотні гадоў. Каб мінімізаваць магчымасць такога заражэння, адных павязак недастаткова. Таму ў абавязковым парадку салдаты-пошукавікі праходзяць вакцынацыю.

Кожны з вайскоўцаў батальёна вучыцца сапёрнай справе. Толькі на выпадак небяспечнай знаходкі ніхто з пошукавікаў абясшкоджваць яе не будзе. У іх кампетэнцыі — умець адрозніць боепрыпасы або выбухованебяспечнае рэчыва, правільна абысціся з імі да прыезду сапёраў.

Вызначыць экспертыза

Забітых і памерлых ад голаду і хвароб вязняў «Шталага 382» хавалі ў ячэйках два на два метры. Глыбіня іх розная. На думку Аляксея Куцука, верагодна, гэта звязана з сезоннасцю пахавання. «З гэтай жа прычыны адрозніваецца і колькасць пахаваных у ячэйках, — гаворыць старшы лейтэнант. — У ямах не больш як паўтара метра глыбінёй пахавана да 15 чалавек, у ячэйках каля 2,5 метра ўглыб колькасць пахаваных даходзіць да 80».

Усяго эксгумаваны астанкі 2440 чалавек (на раніцу 28 верасня). У асноўным, яны належаць мужчынам ва ўзросце ад 20 да 40 гадоў. Больш дакладная інфармацыя будзе вядомая пасля экспертызы.

— Візуальна па астанках можна вызначыць узрост і пол чалавека, — расказвае сяржант Аляксей Міхайлоўскі, фельчар па прафесіі. — Узрост падкажуць швы на чэрапе, крыж — ніжняя частка пазваночніка. Больш вопытныя ўрачы могуць вызначыць узрост па пазванках. Якога полу быў чалавек, раскажа будова шкілета, а таксама форма таза. Па памеры косткі можна меркаваць, гэта астанкі дарослага чалавека або дзіцяці.

Знаходкі як падказка

Дадатковую інфармацыю аб чалавеку могуць даць і суправаджальныя знаходкі. Гузікі ад абмундзіравання, спражкі ад рыштунку, раменныя спражкі, прадметы салдацкага быту, знойдзеныя на месцы канцлагера, пацвярджаюць, што большасць вязняў (калі не ўсе) з'яўляліся ваеннаслужачымі Чырвонай Арміі. Аб тым, што тут адназначна ўтрымліваліся ваенныя людзі, сведчаць і так званыя смяротныя медальёны. На вялікі жаль, знойдзена іх усяго 35 (на 28 верасня). Пакуль удалося ўстанавіць толькі сем імёнаў.

Але вядомых салдат магло б быць значна больш: згодна з загадам Дзяржаўнага камітэта абароны СССР ад сакавіка 1941 года, кожны вайскавец абавязаны быў мець пры сабе медальён. Але трэба ўлічваць, што людзі знаходзіліся ў лагеры для ваеннапалонных, дзе ўсе рэчы канфіскоўваліся. Можна толькі здагадвацца, якім чынам вязням удалося захаваць гэтыя медальёны. І тое некаторыя з іх аказаліся пустымі. У іншых укладыш застаўся, але чысты: па салдацкім павер'і запоўнены азначаў не вярнуцца з вайны. У канцы 1942 года на змену «смяротным медальёнам» прыйшлі чырвонаармейскія кніжкі. 70 гадоў — дастатковы тэрмін, каб знішчыць паперу.

— Самая галоўная для нас знаходка — маленькая эбанітавая капсула, — прызнаецца камандзір спецыялізаванага пошукавага ўзвода. — І пажадана запоўненая. Тым больш, адзін «смяротны медальён» часам дапамагае ўстанавіць лёс нават не аднаго байца. Напрыклад, не так даўно мы працавалі на шпітальным пахаванні ў Гомельскім раёне. Паднялі астанкі 69 байцоў. Быў знойдзены толькі адзін медальён. Але ўстанавіўшы імя салдата, удалося адшукаць спіс амаль усіх пахаваных там чырвонаармейцаў.

***

Астанкі 1650 вязняў «Шталага 382» ужо перададзены мясцовым органам улады. З пашанаю іх перапахавалі на Елісееўскіх могілках Барысава. На мемарыяльнай пліце, якая з'явіцца на брацкай магіле па завяршэнні пошукавых работ, будуць нанесены ўстаноўленыя імёны. І, калі ўсё задуманае атрымаецца, на ўрачыстай цырымоніі перапахавання будзе прысутнічаць не толькі праўнучка аднаго з палеглых вязняў, якую ўжо адшукалі ў Расіі, а і сваякі іншых — ужо вядомых — салдат. А іх, на шчасце, становіцца ўсё больш.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

«СТАБАЛЬНІКІ» З ВЯСКОВАЙ ШКОЛЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Максім штогод праяўляў сябе ў нейкіх прадметах, алімпіядах — па матэматыцы, грамадазнаўстве, нямецкай мове. А вось у алімпіядах па рускай мове ні разу не ўдзельнічаў і тым не менш дасягнуў 100-бальнага выніку. Прычым, да рэпетытара не звяртаўся — з 5 класа з ім працавала **педагог па рускай мове Святлана ЛІСАЙ**. І не толькі на ўроках — на працягу 10-11 класаў Максім сістэматычна хадзіў да Святлана Іванаўны на факультатыўныя заняткі, — адзначае Сцемплеўская.

Што ж тычыцца грамадазнаўства, то, зноў жа, паслугі рэпетытара не спатрэбіліся — з 9 класа з юнаком працаваў **педагог Юрый БУБЕН**. Дзякуючы Юрыю Віктаравічу Максім так зацікавіўся гэтым прадметам, што ў 10 класе паспрабаваў сябе на раённай алімпіядзе. А ў 11-м атрымаў дыпломы першай ступені на раённай, абласной алімпіядах і дыплом другой ступені — на рэспубліканскай алімпіядзе. А яшчэ адзін выхаванец Правамастоўскай школы, **дзевяцікласнік Павел МЯТЛЮК** удастоены дыплома трэцяй ступені на рэспубліканскай алімпіядзе па матэматыцы. Такім чынам, атрымалі два дыпломы рэспубліканскага ўзроўню. Дарэчы, гэта таксама, як са «стабальнікамі», упершыню ў гісторыі школы.

Вольга САМАРДАК на цэнтралізаваным тэсціраванні набрала па рускай мове 94 балы, па хіміі — 91, а масімальнага выніку дасягнула па біялогіі. Толькі па апошнім прадмеце яна займалася з рэпетытарам, бо школьны педагог па біялогіі ў той час хварэў і яго падмянялі настаўнікі з іншых школ раёна.

— У поспехах нашых «стабальнікаў» і дыпламантаў алімпіяд ёсць сістэма, — кажа Вольга Сцемплеўская. — На мой погляд, перш чым вучань пачне паказваць вынікі, неабходна яго «знайсці», вылучыць з усяго класа, вызначыць яго патэнцыял, пасяліць надзею і ўпэўненасць у сваіх сілах, даць магчымасць для навучання па індывідуальнай праграме і штодзённа суправаджаць яго. Трэба знайсці тую тоненькую пакуль яшчэ нітачку, якая псіхалагічна будзе звязваць настаўніка і вучня і ствараць умовы для іх штогадовай сумеснай працы. Педагог дае дзецям неабходныя ім веды, а яны праяўляюць працавітасць і бяруць усё, што трэба. Пры гэтым вельмі важна ўдзельнічаць у алімпіядным руху. Тут нашай «першай ластаўкай» стала ў 2012 годзе **Каця ШЧУКА**, якая вярнулася з каштоўнымі падарункамі з абласной алімпіяды па нямецкай мове, дзе была адзначана як лепшая сельская вучаніца. Пэўна, гэта падштурхнула і іншых дзяцей, у тым ліку Вольгу і Максіма.

А цяпер ужо і іх прыклад пачынае ўплываць на іншых школьнікаў: у 10 класе ёсць дзяўчынкі, якія пажадалі паглыблена займацца грамадазнаўствам, рускай мовай, нямецкай мовай. Убачылі, што дзякуючы гэтым прадметам можна дасягнуць высокага выніку.

З васьмі сёлетніх выпускнікоў Правамастоўскай сярэдняй школы пяцёра паступілі ў вышэйшыя і двое — у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Вольга Самардак — студэнтка фармацэўтычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Максім Сцемплеўскі — студэнт факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Настаўнік гісторыі і грамадазнаўства Юрый БУБЕН, настаўніца нямецкай мовы Яніна КІВЕР, настаўніца матэматыкі Таццяна ТРУХАН і сёлетнія выпускнікі Карына МАЗІК, Павел МЯТЛЮК, Максім СЦЕМПЛЕЎСКІ.

І яшчэ адзін даволі красамоўны факт. Бацькі некаторых школьнікаў пераехалі жыць у райцэнтр, аднак дзеці прыязджаюць адтуль у Правыя Масты і працягваюць вучыцца ў мясцовай школе. Без прымусу, бо падабаецца.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prokopchik@zviazda.by

У тэму

Выпускніца сярэдняй школы № 5 г. Масты, залатая медалістка Лізавета НОВІК сёлета на цэнтралізаваным тэсціраванні атрымала два 100-бальныя сертыфікаты: па рускай мове і матэматыцы. Паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі.

«Прапануйце свае ідэі, а не скардзіцеся...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Чаму?

— Асноўны зварот аўтараў сацыяльных праектаў да бізнесу: «Дайце грошай!» Але кампанія, нават тая, у якой добры прыбытак, не можа выдаткаваць нейкую суму проста так. Бізнес успрымае гэта як сацыяльныя інвестыцыі: мы дадзім грошы, калі атрымаем нейкі вымерны эфект. Мецэнат не можа прафінансаваць ідэю, калі не разумее, як яна будзе рэалізавана. Яму важна, як будуць суадносіцца выдаткі і вынікі і навошта гэты праект у прынцыпе патрэбны грамадству.

— Ці вывучалі замежны вопыт падобных конкурсаў? Як гэта ў іх?

— Вы не паверыце, але ў тым жа 2013 годзе, калі пачынаўся Social Weekend, замежнага вопыту было не так шмат. Еўрапейскія сацыяльныя праекты на той момант падтрымліваліся збольшага за кошт фондаў, арганізацый ЕС. Там размова ішла пра тое, як эфектыўна распарадзіцца грашыма. А конкурсу, які б даваў магчымасць паспрабаваць рэалізаваць праект, навучыў рабіць першыя крокі, не было. Гэты вопыт мы бралі са стартапаў, з бізнес-акселерацый.

«Чаму нешта павінна рабіць дзяржава, калі гэта тычыцца цябе? Вашымі задачамі мусіць займацца грамадства, і ўсюды так ёсць».

— Праекты, якія выходзяць у фінал, атрымліваюць фінансавую падтрымку. А што з астатнімі? Так і застаюцца на ўзроўні ідэй?

— Не. Мы патрабуем, каб на працягу двух месяцаў да фіналу аўтары ўжо рэалізоўвалі праекты. Праводзім для іх навучанне, дзе тлумачым, што рабіць са сваёй ідэяй па-за межамі конкурсу. Кожны раз у нас ёсць удзельнікі, якія адмаўляюцца ад месца ў фінале, бо, аказваецца, у іх і так ужо ўсё атрымалася.

Да таго ж ёсць шэраг мецэнатаў і кампаній, якія намінацыі не выстаўляюць, але сочаць за праектамі і, калі нешта падабаецца, самі шукаюць кантакты аўтараў, каб прапанаваць дапамогу. Адзін з прыкладаў — фестываль казкі «Казачны джэм». Яго падтрымала кампанія velcom.

— За папярэднія конкурсы было пададзена каля 800 заявак. А якіх праектаў паранейшаму не хапае?

— Асноўная доля прапаноў — гэта дабрачыннасць, і не з кожнай такой ідэі можна зрабіць устойлівы праект, за якім што-небудзь будзе далей. Вельмі мала заявак па намінацыях «Аддайся марам і зрабі» (дзе мы чакаем нетрывіяльны спосаб рашэння сацыяльнай задачы) і «Арт-аб'ект». Арт-аб'екты мы ацэньваем з пункту гледжання сэнсавай нагрузкі. Так, на адным з конкурсаў была ідэя зрабіць інтэрактыўную лавачку на рацэ Нямізе — у выглядзе хвалі, якая рэагуе на дотык і ўключае музыку. Як успамін, што менавіта з ракі пачынаўся горад. Спадзяюся, што праект будзе рэалізаваны — мы атрымаем цікавы турыстычны аб'ект.

Напэўна, не ўсе ведаюць і вераць, што калі зробіш першы крок і атрымаеш на яго невялікае фінансаванне, усё далей складзецца хутчэй. Ёсць маладыя архітэктары, якія кажуць: «Для таго каб пабудаваць арт-аб'ект, нам патрэбна 10-20 тысяч долараў, а ў вас больш за пяць не даюць». Мы прапануем ім падумаць, што перашкаджае таму, каб праект з'явіўся хоць бы часткова. Было некалькі выпадкаў, што пяці, і нават трох тысяч долараў з лішкам хапала. Бо тая вялікая заяўленая сума спатрэбіцца праз год. А каб яе атрымаць, трэба паказаць першыя крокі.

— З якімі праблемамі звычайна сутыкаюцца ініцыятары сацыяльных праектаў?

— Не ўмеюць з ідэі зрабіць праект. Пазначыць тэрмін, якія рэсурсы і колькі часу патрэбна. Паспрабаваць знайсці некалькі магчымасцяў, каб рэалізаваць задуму. Не ведаюць, як правільна расказаць пра сваю ідэю. Не на 10 старонках нахвальваць, які ваш праект цудоўны і што ваш гульнявы цэнтр будзе самым лепшым ва ўсёй Беларусі, а знайсці яго адметныя рысы і апісаць у адным абзацы.

Заўважыў, што некаторыя грамадскія арганізацыі, напрыклад зоаабаронцы, не сябруюць між сабой. У кожнага свае крыніцы фінансавання і каналы піяру, і яны не вельмі хочуць дзяліцца. Мне здаецца гэта няправільна. Калі ў нас ёсць бяздонныя жывёлы, трэба ратаваць іх, а не думаць, якая арганізацыя лепш гэта робіць.

— Ці рэальна сацыяльныя праекты рабіць самаакупнымі?

— Безумоўна. І наш конкурс на гэта скіраваны. На 6-м Social Weekend большая частка праектаў-фіналістаў былі самаакупнымі. І што з гэтага сталася? Частка СМІ і нават некаторыя члены журы выказаліся негатыўна. Маўляў, пачакайце, тут жа камерцыйны праект. Але калі сацыяльны складнік выняць з таго бізнесу, вы будзеце карыстацца яго паслугамі? Не. Тады гэта не чыстая камерцыя.

Сацыяльным праектам не соромна зарабляць, і яны мусяць гэтым займацца. Бо як яны будуць развівацца, калі спонсарскія грошы скончацца?

— Якім чынам сацыяльныя праекты могуць зарабляць?

— Самы тыповы прыклад — калі ствараецца нейкі гурток, дзе заняткі для звычайных дзяцей платныя, а для малых з асаблівасцямі, якім гэтыя паслугі жыццёва неабходны, — не. Так праект спрыяе інклюзіі дзяцей з інваліднасцю.

Ёсць непрамыя спосабы фінансавання. Напрыклад, арганізатары Фестывалю сучаснай беларускай драматургіі «White box» плануюць наступны раз прадаваць квіткі для ўдзельнікаў, каб мець грошы на арганізацыйныя расходы: толькі на валанцёрстве ўсё не выцягнеш.

Увага!

Падаць заяўку на конкурс можна да канца тыдня (да 2 кастрычніка ўключна). Для гэтага спачатку зарэгіструйце праект на рэсурсе MaeSens.by. У некалькі абзацах апішыце сваю ідэю: якую праблему рашаеце, што будзе, калі вы яе вырашыце, растлумачце, чаму яна актуальная, і скажыце, чаго вам не хапае, каб гэтую задуму рэалізаваць. А пасля запоўніце заяўку на ўдзел на сайце socialweekend.by. Там жа можаце прачытаць падрабязна пра ўмовы конкурсу і парады па апісанні праекта.

«Мецэнат не можа прафінансаваць ідэю, калі не разумее, як яна будзе рэалізавана. Яму важна, як будуць суадносіцца выдаткі і вынікі і навошта гэты праект у прынцыпе патрэбны грамадству».

— Social Weekend заклікае людзей самім спрабаваць вырашаць праблемы, якія іх хвалююць. Чаму, на вашу думку, сацыяльнымі задачамі павінна займацца не толькі дзяржава?

— А чаму нешта павінна рабіць дзяржава, калі гэта тычыцца цябе? Вашымі задачамі мусіць займацца грамадства, і ўсюды так ёсць. Напрыклад, у Эстоніі, калі бацькам няма куды адвесці дашкольніка, улады не будуюць новы садок. Яны дапамагаюць знайсці памяшканне, але плаціць за яго арэнду, за харчаванне, шукаць выхавацеля мусяць бацькі. Дзяржава павінна дапамагаць, забяспечваць базавыя патрэбы, але яна не можа заняцца ўсімі пытаннямі адначасова проста з-за недахопу бюджэту. Таму мы і хочам, каб грамадзяне заяўлялі свае ідэі і спрабавалі самі іх рэалізоўваць, а не скардзіцца, што ўсё дрэнна.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by.

■ Грамадства

БЕЗ МАТЫВАЦЫІ ЎСЕ НАМАГАННІ МАРНЫЯ

Як арганізавана сацыяльная рэабілітацыя

Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства аховы здароўя і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны аб'ядналі намаганні, каб распрацаваць агульную сістэму адаптацыі да нармальных умоў жыцця тых, хто адбыў тэрмін пакарання ў месцах пазбаўлення волі, а таксама асоб, якія змагаюцца з залежнасцямі.

Як адзначыў **галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Іван КАНАРАЗАЎ**, дзякуючы адпрацаванаму комплексу мер па барацьбе з залежнасцямі колькасць грамадзян, якія стаяць на ўліку, з кожным годам скарачаецца. Аднак паводле статыстыкі злачынствы, якія здзяйсняюць асобы ў стане наркатычнага або алкагольнага ап'янення, складаюць 25% ад агульнай колькасці, у той час як 33% злачынстваў адбыліся па віне тых, хто нідзе не працуе і не вучыцца. Таму тым, хто мае патрэбу, аказваюцца не толькі розныя віды медыцынскіх паслуг — ад неадкладнай дапамогі да працяглай рэабілітацыі, — але і прапаноўваецца садзейнічанне ў працаўладкаванні.

Аднак, як паведаміла **кансультант упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Жанна ШЧАМЯЛЁВА**, зацікаўлены ў гэтым далёка не ўсе. Напрыклад, сярод вызваленых з ЛПП толькі 30% пасля выказваюць жаданне працаваць. Гэта пры тым, што кожны год для тых, хто выйшаў на свабоду (10—12 тысяч чалавек), «браніруецца» каля 6 тысяч працоўных месцаў.

Адным з найважнейшых кірункаў работы па сацыяльнай рэабілітацыі з'яўляецца засваенне асуджанымі прафесійных ведаў і навыкаў. Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення арганізацыі выпраўленчага працэсу дэпартамента выканання пакаранняў МУС Аляксандра КРАЛЬКО**, ёсць выбар простых рабочых спецыяльнасцяў. Акрамя таго, з нядаўняга часу ў месцах пазбаўлення волі ў форме дыстанцыйнага навучання можна атрымаць і вышэйшую адукацыю. Зараз супрацоўніцтва наладжана з Мінскім інавацыйным універсітэтам, які адзіны змог стварыць адпаведныя ўмовы па бяспечным доступе ў сетку інтэрнэт. У жаночай выпраўленчай калоніі №4 горада Гомеля, напрыклад, праходзяць курс навучання 15 асуджаных. На выбар — спецыялізацыі ў сферы псіхалогіі, эканомікі і нават юрыспрудэнцыі. Праўда, аднаго жадання вучыцца недастаткова: трэба мець атэстат, чым можа пахваліцца далёка не кожны зняволены, а таксама магчымасць заплаціць за вучобу — каля 1200 рублёў у год.

Найбольш складаным з'яўляецца час адразу пасля таго, як былы асуджаны выйшаў на волю. Перыяд адаптацыі можа цягнуцца гадамі, аднак, калі жаданне стаць паўнавартасным членам грамадства моцнае, паступова чалавек прыйдзе да сваёй мэты. **Намеснік начальніка ўпраўлення наглядна-выканаўчай дзейнасці МУС Сяргей АЛЯШКЕВІЧ** адзначыў, што, каб падтрымаць тых, хто стаў на шлях выпраўлення, вядзецца работа па арганізацыі Цэнтраў сацыяльнай адаптацыі. Цэнтры будуць аказваць комплексную падтрымку, якая ўключае ў сябе навучанне бытавым навыкам, узаемадзеянне з камп'ютарам, дапамогу ў пошуку работы, а таксама псіхалагічнае суправаджэнне. Гэта дзейнасць ужо прыносіць бачныя вынікі. Калі ў 2010 годзе колькасць рэцыдыўных злачынстваў складала 50%, на цяперашні момант паказчык апусціўся да 38%.

Дар'я КАСКО.
kasko@zviazda.by

■ Змена

«АРЛЯНЯ» РАСПРАВІЛА КРЫЛЫ

У сталіцы пачаў працу патрыятычна-прававы клуб

Члены клуба — юнакі, вучні 6—11 класаў школ Першамайскага раёна, усяго 120 чалавек. Нягледзячы на малады ўзрост удзельнікаў, усё вельмі сур'ёзна: арганізацыю «пад крыло» ўзяў атрад міліцыі асобага прызначэння Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

Кіраўнік Адміністрацыі Першамайскага раёна Ігар КУДРЭВІЧ падкрэсліў на ўрачыстым адкрыцці: «Для любой краіны свету патрыятычнае выхаванне моладзі з'яўляецца краевугольным каменем яе палітыкі. Рэспубліка Беларусь як маладая суверэнная дзяржава не з'яўляецца выключэннем. Для нас галоўнае — захаваць мір, умець абараніць незалежнасць нашай краіны і спакой грамадзян. Таму стварэнне клуба — вельмі важная падзея, якая дапаможа рухацца ў гэтым кірунку».

Мяркуецца, што ў будучыні значная частка хлопцаў стануць супрацоўнікамі праваахоўных органаў. У праграме навучання — практычная стральба, службовае мнагабор'е, спартыўны турызм, прававая і медыцынская падрыхтоўка, радыёсувязь і нават правілы этыкету. Заняткі будуць праводзіцца на працягу ўсяго навучальнага года як на базе ўстаноў адукацыі, так і на базе атрада АМАПа. Падчас адкрыцця клуба ў яго юных удзельнікаў была магчымасць агледзець тэрыторыю часці, пасядзець за рулём сапраўднай ваеннай тэхнікі, паназіраць за паказальнымі выступленнямі па рукапашным баі і нават стаць сведкамі затрымання асабліва небяспечнага, але, на шчасце, несапраўднага, злачынца на аўтамабілі.

«Арляня» — першая ў сваім родзе добраахвотная арганізацыя, якая закранае ўсе аспекты ваенна-патрыятычнага выхавання, дапамагае вызначыцца з выбарам будучай прафесіі, а таксама прапануе вялікую разнастайнасць відаў спорту і адзінаборстваў. Назва клуба была выбрана невыпадкова: арол увасабляе перамогу і адвагу, веліч і духоўны ўздым. Гэта птушка, якая традыцыйна малюецца на адметных атрыбутах формы і сцягах падраздзялення, як мага лепш характарызуе прадстаўнікоў АМАПа. Так і іх падапечныя пад кіраўніцтвам вопытных камандзіраў паступова з арлянят павінны ператварыцца ў сапраўдных арлоў.

Камандзір роты АМАП ГУУС Мінгарвыканкама Дзмітрый БАЛАБА выказаў надзею, што з цягам часу клуб стане ў добрым сэнсе слова элітным і хлопцы змогуць ганарыцца сваім да яго дачыненнем. Гэта першы вопыт такога цеснага супрацоўніцтва АМАПа з установамі адукацыі, таму на арганізатарах ляжыць вялікая адказнасць. Заняткі дапамогуць хлопчыкам падрыхтавацца да будучага дарослага жыцця, што актуальна як для агульнага развіцця, так і асабліва карысна для тых, хто вырашыць звязаць свой лёс з працай у органах правапарадку.

Дзесяцікласнікі з будучай прафесіяй ужо вызначыліся і нават актыўна пачалі рыхтавацца да паступлення. Напружаная сітуацыя ў свеце прымусіла школьнікаў задумацца пра бяспеку сваіх блізкіх і сваёй дзяржавы.

Для ўдзелу ў клубе патрэбна толькі жаданне і медыцынская даведка. Пакуль сярод удзельнікаў адны хлопчыкі, аднак, калі інтарэс з'явіцца і ў юных прадстаўніц прыгожага полу, яны таксама змогуць уступіць у шэрагі арганізацыі.

Дар'я КАСКО.
kasko@zviazda.by

ЗЕМЛЯКІ АБ'ЯДНАЛІСЯ

НА СМАЛЕНШЧЫНЕ ПЛЁННА ПРАЦУЕ БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ АЎТАНОМІЯ

Цяпер у Расіі дзейнічаюць больш за 80 грамадскіх арганізацый беларусаў. Нядаўна Беларуская нацыянальна-культурная аўтаномія з'явілася на Смаленшчыне. Першым мерапрыемствам зямляцтва стала правядзенне ў ліпені патрыятычнага аўтапрабегу па маршрутах першых баёў Вялікай Айчыннай вайны. Асноўныя яго пункты — Смаленск, Орша, Мінск, Глыбокае, Полацк, Віцебск, Рудня. Такім чынам, старт атрымаўся ўдалым. Каб больш даведацца пра цікавых людзей і іх справы, мы звярнуліся да старшыні Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі на Смаленшчыне Сяргея КРЫЎКО.

— Сяргей Расціслававіч, навошта спатрэбілася ствараць такую суполку?

— Тут, пэўна, варта ўспомніць той час, калі я працаваў у адміністрацыі вобласці. У нас уздымаліся пытанні ўзаемадзеяння з нашымі суседзямі, у цэлым з Рэспублікай Беларусь, з Віцебскай, Магілёўскай абласцямі. Ужо тады абмяркоўвалі тое, каб такія кантакты былі не толькі паміж адміністрацыямі і арганізацыямі Смаленшчыны і прыгранічнымі рэгіёнамі Беларусі, але і на грамадскім узроўні. Напрыклад, два рэгіёны — Смаленшчына і Віцебшчына — знітаваны паміж сабой вельмі шчыльна.

Падчас сустрэч з прадстаўнікамі розных арганізацый мы заўсёды абмяркоўвалі магчымасці зрабіць такую арганізацыю, якая дапамагала б беларусам у нас у рэгіёне, ну і адпаведна смалянам у Беларусі. І гэта не проста цікавасць. Бо, нягледзячы на тое, што мы дзве брацкія краіны, у нас розныя законы, якія неабходна выконваць, перасякаючы мяжу. Многія з жыхароў Беларусі, хто хацеў бы паехаць да родных і блізкіх (напрыклад, у Смаленскую вобласць), часцяком аказваюцца перад складаным выбарам. Яны не маюць дастатковай інфармацыі, як правільна паводзіць сябе на тэрыторыі іншай дзяржавы, якія правілы існуюць. Просты прыклад — грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, які знаходзіцца ў Смаленскай вобласці, спатрэбілася медыцынская дапамога. Якім чынам ён зможа, акрамя выкліку хуткай дапамогі, яе атрымаць? Або здарыцца сітуацыя, якая патрабуе ўмяшання паліцыі, тут таксама трэба разумець, куды звяртацца.

Многія беларусы навучаюцца ў расійскіх ВНУ. Я ў свой час, калі кіраваў адной з вышэйшых навучальных устаноў горада Смаленска, сутыкнуўся з такой сітуацыяй. У гэтай ВНУ вучылася прыкладна паўтары тысячы студэнтаў з Рэспублікі Беларусь, мне даводзілася вырашаць, акрамя навучальных, пытанні, якія тычацца побыту, агульначалавечых адносін, і ўжо тады было зразумела, што нельга гэтыя адносіны і знаходжанне на тэрыторыі іншай дзяржавы замыкаць толькі ў рамкі заканадаўства. Нам даводзілася дапамагаць студэнтам адаптавацца ў Смаленску.

У 2013 годзе ўжо на вопыце ўсіх падзей, з якімі я сутыкаўся ў свой час пры выстройванні ўзаемаадносін з беларускімі гасцямі, паўстала ідэя, якая ў далейшым удала ўвасобілася ў жыццё падчас стварэння арганізацыі «Землякі». Яна ставіла сабе мэтай дапамагаць узаемадзейнічаць паміж сабой нашым суседзям-беларусам і смалянам, якія хацелі выязджаць у Расію і Беларусь. Разумеючы, што нельга ахапіць неабсяжнае, у першую чаргу ў гэты перыяд дапамога тычылася толькі тых студэнтаў, якія навучаюцца ў ВНУ, якую я ўзначальваў. Але многія беларускія студэнты, прыязджаючы ў Смаленск, даведаўшыся пра гэта і нават не паступаючы да нас у навучальную ўстанову, прыходзілі ў нашы студэнцкія арганізацыі, у рэктарат, з пытаннямі, якія часам не мелі да навучальнага працэсу ніякага дачынення.

Са стварэннем грамадскай арганізацыі «Землякі» ў нас адразу ж наладзіўся цесны сяброўскі кантакт з беларусамі. Сёння нашы выпускнікі і іншыя жыхары суседняй краіны, якія жывуць доўгія гады на Смаленшчыне, дапамагаюць нам у вырашэнні бытавых пытанняў, якія паўстаюць перад жыхарамі Расіі і Беларусі. Назва «Землякі» аказалася дастаткова ўніверсальнай, да нас сталі звяртацца сябры і госці Смаленшчыны, якія жылі ў іншых краінах, напрыклад у Казахстане, Украіне, Кыргызстане.

Паўстала пытанне наконт таго, каб з усяго патоку зваротаў вылучыць менавіта беларускі складнік. Па заканадаўстве Расійскай Федэрацыі такую дзейнасць павінны выконваць арганізацыі, якія ўяўляюць сабой нацыянальна-культурныя аўтаноміі. Сабраўшыся ў маі гэтага года на ўстаноўчы сход, мы вырашылі стварыць у Смаленску «Беларускую нацыянальна-культурную аўтаномію». Цяпер яна зарэгістраваная ў органах юстыцыі, намечаны план мерапрыемстваў. На першым этапе мы вырашылі ўзаемадзейнічаць не толькі з тымі людзьмі і арганізацыямі, якія знаходзяцца на тэрыторыі Смаленскай вобласці, але і з партнёрамі ў Беларусі, асабліва ў Віцебскай вобласці, таму што гэта тэрытарыяльна самыя блізкія нашы суседзі.

На сваіх першых пасяджэннях распрацавалі крокі, каб стварэнне нашай аўтаноміі сталася сапраўды карысным. Была прапанавана і выпрацавана ідэя з рабочай назвай — «карта беларускага госця». У ёй мы хацелі б апублікаваць інфармацыю, цікавую і карысную жыхарам Рэспублікі Беларусь, якія прыбываюць на тэрыторыю Смаленшчыны і Расійскай Федэрацыі. Гэта будзе своеасаблівы даведнік з патрэбнымі тэлефонамі і адрасамі, напрыклад, гасцініц, экстранных службаў, бальніц, паліклінік, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і іншай інфармацыяй. «Карту» мы плануем распаўсюдзіць з дапамогай мясцовых уладаў, грамадскіх арганізацый на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Цяпер гэты механізм прапрацоўваецца.

З беларускімі сябрамі ўжо правялі першыя перамовы, у прыватнасці з кіраўніцтвам грамадскага аб'яднання «Белая Русь» намецілі першыя сумесныя дзеянні. Мы былі на прыёме ў старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзіміра Цярэнцьева, з якім абмеркавалі нашы прапановы і іх падтрымку ў плане агульных мерапрыемстваў, якія могуць рэальна дапамагчы развіццю сяброўства паміж двума братэрскімі народамі.

Так супала, што першыя дні стварэння нашай арганізацыі прыйшліся на трагічную дату пачатку Вялікай Айчыннай вайны, і ў сувязі з гэтым мы правялі першы аўтапрабег з сімвалічнай назвай «Дарогі 1941 года». Наведалі памятныя мясціны на тэрыторыі Смаленшчыны, Мінскай і Віцебскай абласцей, звязаныя з першымі месяцамі вайны, сустрэліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўнікамі раённых адміністрацый, усклалі кветкі да помнікаў і абеліскаў.

— Перш за ўсё мяркуеце ўзаемадзейнічаць з Віцебшчынай?

— У нас не стаіць задача адразу ўстанавіць кантакты з усімі рэгіёнамі Беларусі. Віцебская вобласць ужо традыцыйна наша даўняя і самая блізкая суседка. Да таго ж атрымалася так, што каля вытокаў стварэння нашай аўтаноміі стаялі ўраджэнцы менавіта Прыдзвінскага краю. Таму, прапаноўваючы сумесныя мерапрыемствы, мы арыентаваліся, перш за ўсё, на гэты рэгіён, бо дзякуючы сувязям мы можам атрымаць неабходную дапамогу ад розных структур Віцебскай вобласці. Хоць у нас шмат планаў і па Магілёўскай вобласці, і па іншых рэгіёнах брацкай Беларусі, я думаю, што на працягу года-двух мы ўстановім сувязі з усімі абласцямі.

— У Смаленску ёсць аддзяленне Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расіі. Наколькі наладжана супрацоўніцтва з гэтай структурай?

— З першага дня рэалізацыі ідэі стварэння Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі мы ўзаемадзейнічалі з аддзяленнем Пасольства, нам не хацелася вынаходзіць ровар. Прапрацоўваючы пытанне стварэння нашай аўтаноміі, звязваліся з шэрагам тэрыторый Расійскай Федэрацыі, і аказалася, што такія зямляцтвы ёсць у Пскове, Цверы, Бранску, яны існуюць яшчэ ў 50 суб'ектах краіны, усе маюць цесныя кантакты з аддзяленнямі Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі. У Смаленску, сустракаючыся з беларускім дыпламатам Чэславам Шульгой, мы даведаліся, якія мерапрыемствы праводзяцца па гэтай лініі. З боку аддзялення Пасольства нам была аказана дапамога ў пошуку патрэбных кантактаў у розных рэгіёнах брацкай краіны.

— Бізнес-колы зацікаўлены ў супрацоўніцтве з беларускай аўтаноміяй у Смаленску?

— Зразумела, што ў стварэнні нашай арганізацыі бізнес і прадпрымальнікі надзвычай зацікаўленыя. Калі я працаваў рэктарам, у нашай ВНУ навучаліся прадстаўнікі дзелавых колаў Беларусі, ведаю, што яны сутыкаліся ў Расіі з пэўнымі праблемамі і пытаннямі. Падчас дыялогу з імі мы мелі магчымасць разам высветліць рэальную сітуацыю ў нашай эканоміцы. Усе ўдзельнікі так званых малочных, газавых і іншых «войнаў» шукалі і знаходзілі выйсце для вырашэння існуючых праблем. І зараз, калі сустракаемся з беларускімі бізнесменамі, прадстаўнікамі грамадскасці і органамі ўлады, адчуваецца, што ўсе бакі разумеюць: стварэнне аўтаноміі ў нашым рэгіёне дапаможа наладзіць узаемаразуменне для рэальнага развіцця.

— На Смаленшчыне ўжо дзейнічае асацыяцыя «Нацыянальны кангрэс Смаленскай вобласці», ці будзеце Вы з ёй узаемадзейнічаць?

— Абавязкова. Калі ў нашай назве гучыць слова «аўтаномія», то гэта зусім не азначае, што мы аддзеленыя або збіраемся гэта зрабіць, наадварот, мы адкрытыя для зносін, для правядзення сумесных мерапрыемстваў. Я ўжо сустракаўся з кіраўніком кангрэса Фаікам Аліевым і знайшоў з ім поўнае паразуменне. У бліжэйшы час мы падрыхтуем дакументы да ўступлення ў «Нацыянальны кангрэс Смаленскай вобласці» і ўпэўнены, што наша беларускае звяно ўпрыгожыць гэтую арганізацыю.

Я перакананы, што ў першую чаргу прадстаўнікам двух нашых брацкіх народаў не хапае жывых, чалавечых зносін, не хапае інфармацыі пра тое, чым жывуць суседнія рэгіёны. Простым людзям Смаленшчыны, Віцебшчыны або іншых рэгіёнаў Беларусі цікава даведацца і аб тым, чым жыве беларуская і расійская глыбінка, якія там адбываюцца падзеі, бо для многіх з нас гэта яшчэ і бацькаўшчына. Мы з задавальненнем прымем удзел не толькі ў буйных мерапрыемствах, але і ў святах, якія праходзяць у раёнах, у вёсках. Традыцыі і звычаі двух братэрскіх народаў падобныя, але разам з тым маюць свае каларытныя адметнасці, пра якія надзвычай цікава і важна даведацца.

Уладзімір ІВАШЧАНКА.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА

ФОТА СЛОВА

Гэты лес заўжды
мне сябрам
быў —
Частаваў чым
мог, дарыў
адхланне,
Ратаваў
ад здрады,
не хлусіў,
Прадракаў
сустрэчу
і расстанне.

Ён і сёння,
ў сумнай цішыні,
Для мяне
на восеньскай алеі
Запаліў чырвоныя
агні:
Асцярожна!
Блізяцца завеі...

■ Педагог года

ХТО НАЙЛЕПШЫ Ў ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ?

Пераможцы рэспубліканскага конкурсу прафмайстэрства «Педагог года ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі» вызначацца напярэдадні Дня настаўніка.

У фінале, які праходзіць гэтымі днямі ў рэспубліканскіх цэнтрах дадатковай адукацыі, удзельнічаюць 22 педагогі па мастацкім, фізкультурна-спартыўным, грамадска-гуманітарным, культурна-забаўляльным, тэхнічным, турысцка-краязнаўчым і экалагічным профілях з усёй краіны. Усіх канкурсантаў чакаюць самапрэзентацыя «Маё педагагічнае крэда», абарона адукацыйнага праекта, правядзенне адкрытых заняткаў у незнаёмай аўдыторыі, а таксама псіхолага-педагагічнае тэсціраванне. Лепшых плануецца вызначыць па ўсіх профільных кірунках. Намеснік міністра адукацыі Віктар Якжык запэўнівае, што напрацоўкі пераможцаў будуць укараняцца ў практыку аб'яднанняў па інтарэсах па ўсёй краіне. На сённяшні дзень у Беларусі дзейнічае больш як 300 устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. У мінулым навучальным годзе ў аб'яднаннях па інтарэсах былі занятыя больш як 390 тысяч дзяцей, падлеткаў і маладых людзей.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ГОРАД СТАРАЖЫТНЫ, СЭРЦАМ МАЛАДЫ

Чым сустракаюць свята случчане

У першыя выхадныя кастрычніка Слуцк адзначыць 900-годдзе з дня заснавання. Чым сустракае юбілей такі старажытны і адначасова малады горад, што тут зроблена за апошнія гады, якія змены адбыліся ў эканоміцы, сельскай гаспадарцы, сацыяльнай сферы і наогул у жыцці случчан, расказаў старшыня Слуцкага райвыканкама Андрэй ЯНЧЭЎСКІ.

— Гады тры таму ў нас быў грандыёзны план па ўладкаванні Слуцка, ад добраўпарадкавання і асфальтавання вуліц да маштабных праектаў накшталт будаўніцтва Лядовага палаца. Але, на жаль, змянілася эканамічная сітуацыя і нашы планы засталіся марамі. Тым не менш мы правялі некалькі раённых суботнікаў. Акрамя таго, у бюджэце таксама запланавалі пэўную суму на абнаўленне горада. Па першае, замянілі частку асфальтавага пакрыцця на вуліцы Леніна. Не мелі мы і Палаца ўрачыстай рэгістрацыі шлюбаў, маладажоны распісваліся ў прыстасаваным для гэтага пакоі. Таму было прынята рашэнне па рэстаўрацыі старога будынка Дома культуры ў Палац шлюбу. Да канца кастрычніка будынак будзе гатовы. Устанавілі помнік Анастасіі Слуцкай.

1 верасня ў гарадскім парку культуры і адпачынку адкрылі новы сучасны фантан з рознакаляровай падсветкай. Гараджане кажуць: як у Барселоне. Вядома, без яго можна было б і абысціся. Але аб такім аб'екце марылі случчане, неаднаразова звярталіся ў райвыканкам. І мы пайшлі насустрач пажаданням грамадскасці.

— Андрэй Уладзіслававіч, у студзені наступнага года споўніцца тры гады, як вас прызначылі кіраўніком раёна. Вядома, у вас былі свае планы. На ваш погляд, што найбольш удалося?

— Перш за ўсё планаваў вывесці на больш высокі ўзровень сельскую гаспадарку. Кожны год мы павялічваем прадукцыйнасць буйной рагатай жывёлы. Па валавой вытворчасці малака трэці год утрымліваем другое месца ў краіне пасля Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. А па асноўных паказчыках, паводле табліцы рэйтынгу Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, знаходзімся на 7 месцы сярод 118 раёнаў Беларусі.

Мы вельмі сур'ёзна развіваем матэрыяльна-тэхнічную базу сельгасарганізацый. Толькі летась пабудавана 21 новае памяшканне ў жывёлагадоўлі. Мы разумеем, што старыя фермы, якія ўзводзілі нашы дзяды і бацькі, састарэлі маральна і фізічна, не адпавядаюць сучасным нормам. Сёлета, вобразна кажучы, здзейснілі рэвалюцыю ў вытворчасці кармоў, што дазволіць атрымліваць больш прадукцыі жывёлагадоўлі. Для захоўвання кармоў пабудавалі вельмі шмат сянажных траншэй.

Як вынік, на гарадскія перапрацоўчыя прадпрыемствы паступаюць большыя аб'ёмы сыравіны. Але на эканоміку ўплываюць агульныя тэндэнцыі ў краіне, за яе межамі. Адпаведна, гэтыя суб'екты гаспадарання не далі раёну той прыбытак, на які мы разлічвалі і які можна было б накіраваць на ўмацаванне сацыяльнай сферы і сяла.

— Тым не менш сацыялка не стаіць на месцы, развіваецца...

— Мы дабудавалі дзіцячы сад за свае грошы. Ні ў каго не прасілі дапамогі. Гэта быў для нас сацыяльна важны аб'ект. У мікрараёне Чэхава не хапала дзіцячай дашкольнай установы. Мы вырашылі пытанне.

Шмат робіцца па ўладкаванні ўстаноў адукацыі, культуры, аховы здароўя. Тут праводзіцца капітальны рамонт гаспадарчым спосабам, што значна танней, чым метадам падраду. Для раённай бальніцы набылі новы тамограф, грошы на яго выдзеліла Міністэрства аховы здароўя, мы патраціліся толькі на падрыхтоўку памяшкання для яго ўстаноўкі.

У 2014 годзе праведзена рэканструкцыя стадыёна «Гарадскі». Пашырана футбольнае поле, пабудаваны новы адміністрацыйны корпус. Раней футбольная каманда «Слуцк» трэніравалася на арандаваным стадыёне ў Салігорску. А паколькі ў Слуцку футбол — гэта не проста футбол, а сацыяльная з'ява, то яго адкрыццё стала сапраўдным святам для гараджан.

Новая аб'язная дарога ад медыцынскага каледжа да Навадворцаў дазволіла разгрузіць ад транспартнага патоку цэнтр горада. Раней у час пік тут цяжка было праехаць — ствараліся заторы. І самае галоўнае — цяпер ад Слуцка да Мінска вядзе сучасная зручная аўтамагістраль. Яе афіцыйнае адкрыццё плануецца на канец кастрычніка — пачатак лістапада. Рэканструкцыя праходзіць пры падтрымцы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшыні Мінаблвыканкама. Раней трасу планавалася рэканструяваць у тры этапы, на гэта пайшоў бы не адзін год.

— Ці прыходзяць у раён інвестыцыі, Андрэй Уладзіслававіч? Калі так, то ў якую сферу ў першую чаргу?

— Хутка павінен адкрыцца дражджавы завод. Гэта сумесны праект цукровараф інаднага камбіната з нямецкімі партнёрамі. Прадпрыемства будзе выпускаць 20 тыс. тон прадукцыі штогод, што дасць магчымасць задаволіць цалкам патрэбы Беларусі ў харчовых дражджах. 10 тыс. тон з іх плануецца пастаўляць на экспарт. Будзе створана каля 80 рабочых месцаў.

— Калісьці Слуцк славіўся сваім півам, макаронамі, мэбляй. Можна рэанімаваць або вярнуць гэтыя вытворчасці. Ці яны ўжо ўчарашні дзень?

— Цяпер Слуцк славіцца іншай прадукцыяй: сырамі, малочнымі і мяснымі вырабамі, ільном.

Шмат гадоў Слуцкі льнозавод лічыўся ў аўтсайдарах. Цяпер тут цалкам праведзена мадэрнізацыя, яго можна назваць прадпрыемствам еўрапейскага тыпу. Па сярэднямесячнай зарплаце завод выйшаў на другое месца пасля цукраварафінаднага камбіната.

На мясакамбінаце праведзены рамонт. У цэлым гэта нядрэннае прадпрыемства, нягледзячы на тыя цяжкасці, з якімі сутыкнулася сёння. Тут дастаткова вытворчых магутнасцяў. Але ёсць праблема з сыравінай, а таксама закрэдытаванасць. Так бы мовіць, камбінат патануў у валютных крэдытах, якіх набраў раней. Спадзяёмся, што рэструктурызацыя крэдытаў дапаможа выйсці з нялёгкай фінансавай сітуацыі.

На Слуцкім сыраробным камбінаце выпускаюць шырокі асартымент прадукцыі. Але зноў жа атрыманы прыбытак ідзе на пагашэнне працэнтаў па банкаўскіх крэдытах, якія даволі значныя. Уплывае на даход і пастаяннае «калыханне» валютных курсавых розніц. Мяркую, гэта часовая бяда ўсіх суб'ектаў гаспадарання. Думаю, з цягам часу яна вырашыцца.

— Як вы мяркуеце, Андрэй Уладзіслававіч, у далейшым што найбольш будзе папаўняць бюджэт раёна: сельская гаспадарка, перапрацоўка, малы і сярэдні бізнес?

— Малы і сярэдні бізнес працуюць у асноўным у гандлі, займаюцца пасрэдніцкімі паслугамі. А вось вытворчасць прыватнікі арганізоўваюць неахвотна. Ёсць, канешне, і ў гэтай сферы энтузіясты, але іх вельмі мала. Адзін з прадпрымальнікаў узяў ў арэнду ў ваенным гарадку сталовую, пераабсталяваў памяшканне, зрабіў басейны, дзе плануе вырошчваць 700 тон кларыевага сома штогод. У Беларусі такой вытворчасці пакуль няма. Але яму не далі банкаўскі крэдыт. Ён сам практычна ўсё зрабіў за свае асабістыя сродкі. Засталося закупіць першую партыю рыбы і корм для яе. Мужчына сцвярджае, што знойдзе неабходную суму і запусціць вытворчасць. Такім людзям хацелася б дапамагчы. На жаль, у раёне няма спецыяльнага фонду, каб выдзеліць для такіх энтузіястаў неабходную суму пад ільготныя працэнты.

— Андрэй Уладзіслававіч, горад стаў вядомым і пазнавальным сярод замежнікаў, калі мадэрнізавалі прадпрыемства «Слуцкія паясы»...

— Сапраўды так. Раней у Слуцка, на мой погляд, не было сваёй візітнай карткі. На сённяшні дзень гасцям можна паказаць адноўленую вытворчасць паясоў, станок, на якім яны ткуцца. Сучасныя майстры робяць іх дакладныя копіі, аналагі і мастацкія стылізацыі, якія з'яўляюцца эксклюзіўнымі сувенірамі. Менавіта слуцкія паясы сталі сімвалам не толькі Слуцка, але і Міншчыны, Беларусі. Вырабы добра раскупляюцца. Тавар бяруць дзяржаўныя ўстановы, замежныя прадстаўніцтвы. У Слуцк едуць турысты, экскурсіі распісаны літаральна па мінутах.

— Ці лічыце вы, ураджэнец Гродзенскай вобласці, сябе случчанінам?

— Можа быць яшчэ зарана. Пражыў тут з сям'ёй пакуль няпоўныя тры гады. Але нават дзеці, якія па першым часе прасілі амаль што кожныя выхадныя адвезці іх да бабуль і дзядуляў у Астравец, сталі туды ездзіць радзей. Маўляў, далекавата — 270 кіламетраў. Цяпер у іх новыя сябры, свае справы.

— У свой час кіраўніцтва Маладзечна марыла зрабіць яго горадам-сонцам. Якім вы бачыце Слуцк, скажам так, праз 10—15 гадоў: горадам-садам, горадам-казкай?

— Ва ўзоры на слуцкіх паясах арганічна ўплецены ярка-сінія васількі, якія можна ўбачыць на беларускіх палях. Так што Слуцк можа стаць горадам-васільком *(смяецца)*.

У ТАНЦЫ — 20 ГАДОЎ

Случчане ўжо не ўяўляюць свайго жыцця без народнага аматарскага харэаграфічнага ансамбля «Кордэс», які ўносіць разнастайнасць у культурнае жыццё горада.

— Наш калектыў створаны ў 1993 годзе, — расказала кіраўнік ансамбля Наталія Мартыновіч. — Сёлета спаўняецца 10 гадоў, як мы атрымалі званне «народнага». У нас рознаўзроставая аўдыторыя — ад 18 да 30 і нават 40 гадоў. Гэта людзі розных прафесій: псіхолагі, ваеннаслужачыя, педагогі, бухгалтары, работнікі культуры, прадпрыемстваў і ўстаноў Слуцка. Ёсць таксама некалькі харэографаў. Рэпертуар у ансамбля рознабаковы: народныя стылізаваныя, тэатралізаваныя, тэматычныя кампазіцыі, эстрадныя танцы.

Без «Кордэса» не абыходзіцца ніводнае раённае, гарадское свята. Вельмі часта танцораў запрашаюць на абласныя фестывалі, конкурсы. Прымалі самадзейныя артысты ўдзел і ў рэспубліканскіх мерапрыемствах. У мінулым годзе, напрыклад, іх запрасілі выступіць на сцэне Палаца Рэспублікі ў канцэрце да Дня Незалежнасці. У 2008 годзе яны бралі ўдзел у міжнародным фестывалі харэаграфіі «Сожскі карагод» у Гомелі, дзе занялі другое месца ў намінацыі «Эстрадны танец». Пабывалі з канцэртам і ў расійскім Ржэве — горадзе-пабраціме Слуцка — у складзе творчых калектываў Слуцкага дома культуры. Гастралявалі ў Віцебскай, Брэсцкай абласцях.

— Канешне, хацелася б больш бываць за межамі Беларусі, але, як правіла, міжнародныя фестывалі ладзяцца на платнай аснове. Спонсараў у нас няма. А самім удзельнікам цяжка выкраіць з асабістага бюджэту, напрыклад, 350 еўра: у кожнага сям'я, дзеці, — кажа Наталія Міхайлаўна.

Калектыў пастаянна абнаўляецца, сюды прыходзяць новыя таленты. Ёсць тут і старажылы, якія танцуюць па 10—15 гадоў. А Аляксандр Фамін тут амаль з дня заснавання ансамбля.

Два разы на тыдзень удзельнікі «Кордэса» спяшаюцца на рэпетыцыі: прапусціць заняткі, як і ў школе, недазваляльная раскоша. Людзі прывыкаюць да гэтага рытму, жывуць сваім ансамблем. «Яны сталі адной дружнай сям'ёй», — адзначыла мая суразмоўца.

Прыйсці ў ансамбль можа кожны ахвотны, нават той, хто ні разу ў жыцці не танцаваў, але мае да гэтага вялікае жаданне і здольнасці. Яны растуць тут творча і нават набіраюць свае калектывы. У прыватнасці, Хрысціна Дайняк два гады таму стварыла дзіцячы калектыў — спадарожнік «Кордэса» — «Коркуліс» (у перакладзе з лацінскай мовы — «маленькія сэрцы»). Спачатку набірала сюды пяцігодак, а цяпер ужо і выхаванцаў трох-чатырох гадоў.

Балетмайстар Таццяна САВІЧ і рэжысёр народнага тэатра Хрысціна ДАЙНЯК у старажытных строях для самадзейных артыстаў ансамбля.

ЛЮДЗІ ВЫБІРАЮЦЬ СТАБІЛЬНАСЦЬ

Гэта найлепшым чынам відаць на прыкладзе Слуцкага лясгаса

У ліпені гэтага года калектыў Слуцкага лясгаса адсвяткаваў 80-годдзе з дня заснавання свайго прадпрыемства. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі лясамі Случчыны валодалі князі Радзівілы і іншыя памешчыкі: блізкасць рэк Нёмана, Пцічы спрыялі сплаву лесу і атрыманню добрага прыбытку. Да гэтых водных артэрый былі падведзены чыгуначныя вузкакалейкі, рэшткі якіх захаваліся на тэрыторыі Вараб'ёўскага і Сялецкага лясніцтваў.

На ўчастках лясной гаспадаркі працуе сучасная, высокапрадукцыйная тэхніка.

У 1936 годзе ў выніку арганізацыі Галоўлесааховы СССР быў створаны Слуцкі лясгас. Першапачаткова ў яго ўваходзіла 8 лясніцтваў: Вараб'ёўскае, Гольчыцкае, Заслучанскае, Чырвонаслабодскае, Орлікаўскае, Старыцкае, Урэцкае. На той час тут працавала 78 чалавек. Для выканання пагрузачных і разгрузачных работ на прадпрыемстве налічвалася толькі 35 коней і 2 грузавыя аўтамабілі. На яго былі ўскладзены функцыі аховы, аднаўлення лясоў і вытворчасць тавараў для патрэб народнагаспадарчага комплексу і людзей. Гэта дугі, аглоблі, сані, гонта, палазы, колавыя спіцы, абады. Затым, з развіццём вытворчасці, пачалі з'яўляцца станкі, якія перапрацоўвалі драўніну на піламатэрыялы. Падчас Вялікай Айчыннай вайны лясгас спыніў дзейнасць, якую аднавіў пасля перамогі. Першым дырэктарам лясгаса быў Піліп Сцяпанавіч Ушакоў, потым прадпрыемства ўзначальвалі Аляксей Данілавіч Ганчароў, Яраслаў Аляксандравіч Гурыновіч, Аляксандр Рыгоравіч Жылко. Год таму на чале лясгаса стаў Мікалай Анатолевіч Ражкоў. За 80 гадоў дзейнасці на прадпрыемстве змяніліся толькі чатыры кіраўнікі. Гэта вялікая рэдкасць.

Намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Аляксандр ЖЫЛКО, галоўны ляснічы Раман АЖЫГАР, вядучы інжынер па ахове лесу Іван ПАДДУБІЦКІ.



Інжынер па падрыхтоўцы кадраў Наталля МЯТЛА і вядучы эканаміст па планаванні Святлана ЖЫЛКО.

— Нашаму прадпрыемству шанцавала на ўдалых, талковых, адукаваных кіраўнікоў, якія закладвалі яго фундамент. І кожны наступны з іх прыўносіў нешта сваё, новае, — лічыць намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Аляксандр Жылко. — Дзякуючы іх намаганням, асабістаму ўкладу ў развіццё, Слуцкі лясгас даволі стабільнае, прадпрыемства, якое выконвае ўсе ўскладзеныя на яго функцыі.

На сённяшні дзень плошча лясгаса 60 тыс. гектараў. Гэта 6 лясніцтваў: Вараб'ёўскае, Жылін-Бродскае, Сялецкае, Гольчыцкае, Амговіцкае, Урэцкае, дзе працуюць 320 чалавек. Лясы знаходзяцца ў асноўным на тэрыторыях Слуцкага раёна, часткова — Пухавіцкага, Любанскага, Старадарожскага раёнаў і нязначна — на тэрыторыі Салігорскага раёна.

Кожнае з іх прадстаўлена ляснічым, памочнікам, 3 майстрамі і лясной аховай у колькасці 10-12 чалавек. Усяго ў штатным раскладзе лясгаса працуе 66 леснікоў.

Слуцкі лясгас — шматпрофільнае прадпрыемства. У яго структуру акрамя лясніцтваў уваходзяць адасобленыя падраздзяленні: майстарска-вытворчы ўчастак па перапрацоўцы драўніны ў вёсцы Жылін Брод, паляўнічая гаспадарка, а таксама пітомнік. Менавіта ён закладвае аснову будучых лясоў. Плошча пітомніка 24 гектары, працуюць тут 8 чалавек. Штогод яны вырошчваюць 2-3 млн сеянцаў драўняных і куставых парод каля 50 відаў. Лішкі іх пасля пасадкі рэалізуюцца насельніцтву, прадпрыемствам, жыллёва-камунальнай гаспадарцы для азеляненння і ўпрыгожання асабістых падворкаў, горада. Пітомнік забяспечаны неабходнымі машынамі і механізмамі: трактарам, саджалкамі, сеялкамі, культыватарамі. Ёсць домік для адпачынку людзей. У зімовы перыяд яны займаюцца перапрацоўкай шышак, з якіх атрымліваюць насенне. Штогод работнікі лясгаса ствараюць лясы на плошчы 150–200 гектараў. Тым самым забяспечваюць бесперапынны працэс своечасовага лесааднаўлення на высечках, прагалінах, неўрадлівых землях. Дзякуючы іх намаганням лясістасць Слуцкага раёна павялічылася і складае больш як 20%.

Новыя лясы патрабуюць карпатлівага догляду, пастаяннага клопату. Менавіта леснікі дапамагаюць выкарыстаць маладняк да спелага ўзросту. Яны праводзяць высечкі, прарэджванне, санітарныя, праходныя высечкі. Штогод высечкі догляду за маладымі насадкамі праводзяцца на плошчы больш як 400 гектараў, высечкі догляду за лесам — у памеры больш як 30 тыс. метраў кубічных.

Лес — гэта не толькі флора, але і фаўна, якія цесна ўзаемазвязаны паміж сабой. Значную ролю ў гэтых узаемаадносінах адыгрываюць работнікі лесапаляўнічай гаспадаркі, якія праводзяць комплекс ахоўных работ для аднаўлення і падтрымкі колькасці асноўных відаў жывёл. А лясы Случчыны, варта сказаць, не бедныя. У іх водзіцца шмат аленяў, ласёў, казуль, зайцаў, куніц, ліс, вадаплаўнай птушкі. Для прыёму гасцей узведзены паляўнічы дом на чатыры спальныя месцы. У ім прадугледжаны ўсе ўмовы для адпачынку і

За 80 гадоў дзейнасці на прадпрыемстве змяніліся толькі чатыры кіраўнікі. Гэта вялікая рэдкасць.

камфорту суайчыннікаў і замежных грамадзян, які прыязджаюць на паляванне: усе камунальныя выгоды, більярд. Каля доміка зроблены вальер, дзе ўтрымліваецца каля 20 ланяў. Па дасягненні пэўнага ўзросту яны будуць выпушчаны ў лясныя ўгоддзі. Паляўнічая гаспадарка прыносіць штогод больш як 1 млрд рублёў у недэнамінаваных цэнах.

Укараненне прагрэсіўных тэхналогій у лясной гаспадарцы, новых машын і механізмаў дазваляюць знізіць аб'ём ручной працы, палепшыць умовы працы. На працягу апошніх пяці гадоў у лясгасе 60% аб'ёму нарыхтоўкі драўніны забяспечваецца айчыннымі комплексамі Амкадор 2551 і Амкадор 2661. Валка, сечка сукоў, распілоўка, вываз яе на прамежкавы склад робіцца машынамі і дазваляе павысіць вытворчасць працы на лесасечных работах. Штогод лясгас нарыхтоўвае і вывозіць спажыўцам 100–120 тыс. кубаметраў ліквіднай драўніны.

Значная ўвага ўдзяляецца і перапрацоўцы драўніны. Для гэтых мэт створаны майстарска-вытворчы ўчастак у вёсцы Жылін Брод. Тут устаноўлены тры лініі па перапрацоўцы дробнатаварнай драўніны, а таксама — брусавы, многапілавальны, тарцовачныя станкі. Тут штомесяц выпускаецца каля тысячы кубоў піламатэрыялаў, якія рэалізуюцца арганізацыям і прадпрыемствам Слуцкага раёна, Мінскай вобласці. Ідуць яны і на экспарт, а таксама для патрэб мясцовага насельніцтва. Штомесячная выручка майстарска-вытворчага ўчастка — 150 000–200 000 тыс. рублёў, экспартная выручка больш як 60 тыс. долараў ЗША.

Усе цэхі ацяпляюцца сваёй кацельняй, там жа знаходзяцца гаражы, запраўка для транспарту, дзве артэзіянскія свідравіны, якія забяспечваюць вадой не толькі вытворчасць, але і дамы работнікаў. У свой час у Жыліным Бродзе лясгас пабудаваў пачатковую школу, сталовую, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, клуб на 200 пасадачных месцаў, дзіцячы сад, адміністрацыйны будынак, будынак лясніцтва. Усе гэтыя аб'екты функцыянуюць і цяпер, акрамя сталовай і школы. Навучальная ўстанова прыстасавана пад жылы дом, а пункт грамадскага харчавання перапрафіляваны ў бытоўкі з цёплай і халоднай вадой. У памяшканнях устаноўлены таксама халадзільнікі, мікрахвалевыя печы, дзе людзі могуць разагрэць «ссабойкі», папіць кавы або гарбаты.

— Рэнтабельнасць нашага лясгаса каля 15%. Гэта дазваляе пастаянна развіваць, мадэрнізаваць вытворчасць, закупляць новую тэхніку і абсталяванне, — канстатуе Аляксандр Жылко. — На сённяшні дзень кожнае лясніцтва забяспечана двума трактарамі, цялежкамі для падвозкі драўніны, а ляснічыя — персанальным транспартам для аператыўнага рашэння ўсіх пытанняў. Ёсць у нас пажарныя машыны, тэхніка для падвозу людзей на аб'екты. Для вывазу лесу маем 7 машын вытворчасці Мінскага аўтамабільнага завода, для нарыхтоўкі лесу — два «Фарвардары», тры «Харвестары». Штогод лясгасам праводзяцца будаўнічыя работы ў лясніцтвах, рамантуюцца і будуюцца патрэбныя для вытворчасці збудаванні. Усё гэта робіцца для людзей. Мы разумеем, што ўмовы, у якіх знаходзіцца чалавек, уплываюць на яго працоўны настрой, эфектыўнасць і аддачу на вытворчасці.

За многія гады ў Слуцкім лясгасе сфарміраваліся свае, асаблівыя, падыходы ў рабоце з кадрамі. Тут стаўку робяць на месцічаў. У калектыве і галоўныя спецыялісты, і сярэдняга звяна свае. Чалавек, які нарадзіўся на Случчыне, застаецца прывязаным да свайго краю назаўжды, трымаецца сваёй работы. Таму на прадпрыемстве і цякучасць кадраў нязначная — 5-7% у год. У лясгасе склаліся цэлыя дынастыі. Напрыклад, ва Урэцкім лясніцтве працаваў ляснічым Уладзімір Аляксандравіч Есіповіч. Сын Васіль ужо больш як 30 гадоў шчыруе лесніком, яго жонка — бухгалтар, іх сын аператар лесанарыхтоўчай машыны. Іван

Слуцкі лясгас — шматпрофільнае прадпрыемства. У яго структуру акрамя лясніцтваў уваходзяць два адасобленыя падраздзяленні: майстарска-вытворчы ўчастак па перапрацоўцы драўніны ў вёсцы Жылін Брод, паляўнічая гаспадарка, а таксама пітомнік.

Уладзіміравіч Гудкоўскі больш як 40 гадоў аддаў Амговіцкаму лясніцтву. Спачатку ён працаваў лесніком, а з 1978 года працуе ляснічым Амговіцкага лясніцтва. Яго сын цяпер памочнік ляснічага, нявестка таксама працуе ў лясніцтве, тут жа працавала і жонка Івана Уладзіміравіча.. І такіх дынастый тут шмат.

Людзі выбіраюць стабільнасць. Як кажуць, ад добрага лепшага не шукаюць.

— У нас больш як 13% чалавек адпрацавалі па 20 і 30 гадоў, 11% па 30 гадоў і больш, — адзначыў Аляксандр Жылко. — Самае галоўнае, што мы да людзей ставімся па-людску. У калектыўным дагаворы закладзены пункты, якія стымулююць іх да эфектыўнай працы. Напрыклад, пры выхадзе на пенсію ў залежнасці ад працоўнага стажу на прадпрыемстве работніку аднаразова выплачваецца ад 4 да 8 сярэднямесячных зарплат. Прадугледжана таксама шмат іншых ільгот і прэферэнцый.

УНП 600195028

У доміку паляўнічага заўжды гатовыя прыняць гасцей.

Тут прадстаўленыя ўзнагароды, атрыманыя аматарамі спорту на спаборніцтвах розных узроўняў.

ПРАДУКЦЫЯ, ВАРТАЯ КАМПЛІМЕНТАЎ

Якасць і арыгінальны дызайн упакоўкі робяць прадукцыю Слуцкага сыраробнага камбіната пазнавальнай як у Беларусі, так і за яе межамі

Адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі сыраробны камбінат» — найбуйнейшы вытворца натуральных малочных прадуктаў у Мінскай вобласці. Яно вядзе адлік сваёй гісторыі з 1935 года. Менавіта тады ў Слуцку быў пабудаваны невялікі масласырзавод. Цяжка ўявіць з сённяшніх пазіцый, што прадпрыемства перапрацоўвала ўсяго 2,8 тыс. тон малака за год, а працавала тут 35 чалавек.

Майстар-сыраробы Іван УЛАСЕВІЧ на сваім рабочым месцы. Ад яго ў многім залежыць якасць прадукцыі.

Сыраробы Аляксандр ДАНЦОЎ, майстар-сыраробы Святлана МІХАЙЛАВА, начальнік сырнага цэху Канстанцін ШУМАНІН.

У 2003 годзе да камбіната былі далучаны Старадарожскі, Уздзенскі малочныя заводы, а ў 2006-м — Пухавіцкі. У 2013 годзе ў яго ўвайшлі Любанскі сыраробны завод і яго салігорскі філіял, ААТ «Клецкая крыначка» з нясвіжскім філіялам, Капыльскі масласырзавод. Сёння камбінат перапрацоўвае да 1500 тон малака за дзень і налічвае 3,5 тыс. чалавек.

Такім чынам, слуцкі камбінат стаў універсальнай кампаніяй, якая аб'яднала некалькі вытворчых пляцовак Мінскай вобласці. Аднак комплекснае прадстаўленне яго як холдынга на рынку было недастатковым. Спатрэбілася распрацоўка цэласнага моцнага карпаратыўнага брэнда з адной паслядоўнай камунікацыяй.

Так з'явіўся брэнд Complimilk. Ён стаў вынікам сумеснай працы спецыялістаў кампаніі Brandia Central і супрацоўнікаў камбіната. Назва Complimilk сведчыць: гэта смачная і карысная прадукцыя, вартая камплімента. Асартымент вырабаў сапраўды здзіўляе сваёй разнастайнасцю: сыры сычужныя, сыры плаўленыя, сырныя рулеты, сыры плаўленыя каўбасныя вэнджаныя, тварог і масы тварожныя, масла, марожанае, цэльнамалочная прадукцыя на любы густ, маянэз, сухое абястлушчанае малако і сухая малочная падсырная сыроватка, казеін.

На камбінаце клапоцяцца аб тым, каб прадукцыя была канкурэнтаздольнай. З гэтай мэтай пастаянна праводзіцца мадэрнізацыя, закупляецца новае сучаснае абсталяванне, ідзе абнаўленне асноўных фондаў. У развіццё ўкладваюцца сродкі камбіната.

На прадпрыемстве выкарыстоўваюць сучаснае высокапрадукцыйнае абсталяванне. Працаваць на ім даверана вопытным работнікам — такім, як аператар выпрацоўкі сыру Святлана ІВАНОВА.

У выніку калектыўных творчых пошукаў у камбіната з'явілася новая гандлёвая марка COMPLIMILK. Гэтае слова аб'яднала назву тавару (milk — малако) і адначасова эмацыйнае адценне, сугучнае з «кампліментам». Эмблема ў выглядзе сэрца — працяг задуманай кампазіцыі — прызнанне, камплімент пакупніку. Зялёны колер эмблемы нагадвае пра натуральнасць прадукту. Гэта асабліва важна ў канкурэнтным асяроддзі, калі нестандартныя афармленне, дызайн дазваляюць распазнаць прадукт слуцкіх вытворцаў сярод дзясяткаў іншых малочных прадпрыемстваў. Ужо толькі па адной арыгінальнай упакоўцы можна ўбачыць, што гэта прадукцыя Слуцкага сыраробнага камбіната. Як правіла, на ўпакоўках іншых вытворцаў часта змешчаны стандартныя выявы кароў, лугу, травы. На ўпакоўцы Complimilk — палявыя кветкі ў гліняным збанку. Калі да гэтага былі проста смачныя і карысныя прадукты з добрай назвай і ўпакоўкай, то цяпер філасофія маркі Complimilk сведчыць: гэта смачная і карысная прадукцыя, вартая камплімента. Асартымент вырабаў сапраўды здзіўляе сваёй разнастайнасцю: сыры сычужныя, сыры плаўленыя, сырныя рулеты, сыры плаўленыя каўбасныя вэнджаныя, тварог і масы тварожныя, масла, марожанае, цэльнамалочная прадукцыя на любы густ, маянэз, сухое абястлушчанае малако і сухая малочная падсырная сыроватка, казеін.

Толькі на працягу трох апошніх гадоў замежнымі фірмамі сюды было пастаўлена 76 фур новага абсталявання, што дало магчымасць мадэрнізаваць апаратны, сырныя цэхі, салільнае аддзяленне і цэх вырабу сухіх малочных прадуктаў.

Асаблівы гонар камбіната — свая міні-цеплаэлектрастанцыя. Рэалізацыя гэтага праекта дазволіла значна скараціць затраты на набыццё паліўна-энергетычных рэсурсаў і знізіць сабекошт прадукцыі. З гэтай жа мэтай камбінат прабурыў артэзіянскую свідравіну глыбінёй 430 метраў. Частку вады сыраробы выкарыстоўваюць для патрэб вытворчасці, частку пастаўляюць у гарадскую водаправодную сетку. Па разліках геолагаў, вада гэтая па сваёй якасці і спажывецкіх характарыстыках — адна з найлепшых у краіне.

У другім паўгоддзі 2006 года была праведзена мадэрнізацыя сыраробнага цэха, усталявана лінія маркі DAMROW (Данія) па вытворчасці цвёрдых сычужных сыроў.

У сыраробны цэх закуплена сучасная ўльтрафільтрацыйная ўстаноўка вытворчасці фірмы ГЕА(Германія). Укараненне тэхналогіі ўльтрафільтрацыі дало магчымасць павялічыць колькасць бялку ў сумесі для вытворчасці сыру і тварагу, а таксама выхад гатовай прадукцыі пры захаванні высокай якасці. У канцы 2009 года пачалася мадэрнізацыя сушыльных установак цэха сухіх малочных прадуктаў. Гэта было выклікана неабходнасцю нарасціць магутнасці па выпуску сухога абястлушчанага малака і сухой малочнай сыроваткі. Былі заменены дзве старыя сушылкі агульнай вытворчасцю 2000 кілаграмаў па выпаранай вільготнасці за гадзіну на новыя сушылкі з агульнай вытворчасцю 3400 кілаграмаў за гадзіну. Былі змантіраваны ўстаноўка ўльтрафільтрацыі магутнасцю 7500 л/г і ўстаноўка нанафільтрацыі магутнасцю 30 тысяч літраў сыроваткі за гадзіну, а таксама ўстаноўка зваротнага осмасу вытворчасцю 25 тысяч літраў абястлушчанага малака. Устаноўлены лінія для нарэзкі і ўпакоўкі сыроў вытворчасцю 1500 кілаграмаў упакаванага сыру за змену і новая італьянская лінія па вытворчасці марожанага.

У 2015 годзе на камбінаце запусцілі новую лінію чэшскай фірмы VPS па вытворчасці сыроў. Яна прынцыпова адрозніваецца ад старой лініі тым, што тут устаноўлена фармовачная ванна замест фармовачнай калоны. Абедзве гэтыя лініі цалкам аўтаматызаваныя і дазваляюць вырабляць сыры як у еўраблоках, так і ў круглых галоўках, а таксама з закругленымі гранямі.

Новая лінія дала магчымасць прыбраць венгерскія ванны адкрытага працэсу, дзе варыўся сыр, і паставіць закрытыя катлы. У выніку павялічылася вытворчасць прадукцыі. Калі раней выпускалася максімум 40 тон сыроў штодзень, то цяпер — 60 тон. За кошт гэтага з'явіліся элітныя групы сыроў, тэрмін паспявання якіх большы за 60 дзён (у «Пармізану Gold», напрыклад, усе 90). Акрамя пастаяннага попыту на сыры, тэрмінам паспявання 30–45 сутак, таксама значна павялічыўся попыт на сыры з працяглым тэрмінам паспявання (60–90 сутак). У камерах паспявання знаходзіцца больш як тысяча тон сыроў розных гатункаў. У сувязі з павелічэннем аб'ёмаў вытворчасці і пераходам на больш працяглы тэрмін іх паспявання ўведзены ў дзеянне дадатковыя складскія памяшканні з аўтаматычнымі крыніцамі холадазабеспячэння. Новае абсталяванне забяспечвае ў камерах усе параметры тэмпературнага рэжыму, што ўплывае на якасць. Камбінат працуе пад заяўку спажыўцоў, у асноўным прадукцыя ідзе ў Расію, а таксама ў Арабскія Эміраты, Злучаныя Штаты Амерыкі, Канаду, краіны Заходняй Еўропы. Сёлета, напрыклад, экспарт у агульнай долі прадукцыі складае 65%. Што тычыцца сыроў, то наогул 90%. Акрамя сыроў, экспартуюцца масла сметанковае, сухое малако і сыроватка, харчовы казеін, якія пастаўляюцца ў Расію, Узбекістан, Азербайджан, Арменію, Малдову, Украіну, Літву, Германію. Асвойваюцца новыя рынкі збыту. Прычым на камбінаце строга кантралююць графік пастаўкі на знешнія рынкі. Ад партнёраў патрабуецца дакладны і своечасовы разлік.

Неабходнасць расшырэння рынкаў збыту прадукцыі, забеспячэння канкурэнтаздольнасці айчынных тавараў на сусветных рынках, павышэння экспартных магчымасцяў прымусіла кампанію звярнуць увагу на ўкараненне патрабаванняў міжнародных стандартаў. З 2012 года Слуцкі сыраробны камбінат пастаўляе прадукцыю на рынкі Еўрасаюза. BY000032 — пад такім нумарам у рэестры, які дазваляе адгрузкі ў краіны Еўрасаюза, значыцца Уздзенскі філіял ААТ.

Лабаранты Наталья КУХАРЭНКА і Вольга БАБЕНЯ вызначаюць якасць сыравіны.

У камерцыйным аддзеле гандлёвым партнёрам прапануюць азнаёміцца з выстаўкай прадукцыі. Вядучы спецыяліст па продажы Алена ЦВІРКО дэталёва раскажа пра асартымент.

НАШЫ ЎЗНАГАРОДЫ

Слуцкі сыраробны камбінат — пастаянны ўдзельнік розных выставак, кірмашоў. Па яго прадукцыю ў Расіі выстройваюцца чэргі. На адным з кірмашоў намеснік губернатара Новасібірскай вобласці так ацаніў слуцкую прадукцыю: «Па якасці з беларускай прадукцыяй наўрад ці якая іншая можа параўнацца». Пра высокую якасць слуцкай «малочкі» сведчаць шматлікія ўзнагароды. У прыватнасці, з апошніх — дыплом за ўкараненне інавацый і высокую якасць прадукцыі навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. А таксама дыплом лаўрэата міжнароднага конкурсу «Найлепшы прадукт-2016» і залаты медаль за сыр «Пашахонскі 45%», «Кастрамскі 45%», масла «Сялянскае 72,5%». Конкурс праходзіў у Маскве. А слуцкі сыр «Пармізан Gold» на рэспубліканскай прэміі «Лідар года — 2015» прызнаны найлепшым у краіне. Лаўрэатаў конкурсу вызначаў экспертны савет — прадстаўнікі буйных бізнес-таварыстваў.

УНП 600119098

ЧАМУ ХЛЕБ ЧОРНЫ, ЧАМУ БЕЛЫ

Бацькі лічаць за гонар аддаць сваіх малых у яслі-сад №4

У 1990 годзе яслі-сад №4 г. Слуцка прыняў першых наведвальнікаў. І да гэтага часу бацькі лічаць вялікай удачай атрымаць пуцёўку для свайго малога ў гэтую прэстыжную дзіцячую ўстанову. Кожны выхаванец — яркая асоба, упэўнены педагогі, якія прымяняюць у сваёй рабоце прагрэсіўныя методыкі.

Як вядома, першы год у школе для пачаткоўцаў даволі складаны. Назіранні псіхолагаў, фізіёлагаў, педагогаў паказваюць, што сярод іх ёсць дзеці, якія цяжка адаптуюцца да новых умоў, рэжыму вучобы, толькі часткова засвойваюць урокі. Пачатак школьнага навучання становіцца для малых моцным стрэсам. Радасць ад паступлення ў школу, новыя ўражанні часта перамяжоўваюцца з пачуццём трывогі, напружання і разгубленасці. Хтосьці становіцца непаслухмяным, а нехта, наадварот, занадта ціхмяным. У кагосьці прападае апетыт, парушаецца сон. Дзіця павінна быць дастаткова сталым у фізіялагічных і сацыяльных адносінах, дасягнуць адпаведнага разумовага ўзроўню, запасу ведаў аб навакольным свеце.

— Я прыкмеціла, што дзеці, якія прыходзяць у школу, могуць быць добра падрыхтаваныя фізічна і нават мець пэўныя веды па праграме. Але ім цяжкавата ў псіхалагічным плане: няма матывацыйнай гатоўнасці да перамен. Многія не ведаюць да чаго ім трэба рыхтавацца ў старэйшай групе дзіцячага сада, каб потым вучыцца ў школе, — расказала намеснік загадчыка дашкольнай адукацыі дзяржаўнай установы «Яслі-сад №4 г. Слуцка» Людміла Апанасевіч. — У выніку мы распачалі праект па фарміраванні ў сваіх выхаванцаў адаптацыйных магчымасцяў да навучання. І вырашылі яго ажыццявіць пры садзейнічанні некалькіх зацікаўленых удзельнікаў: бацькоў, псіхолагаў, настаўнікаў пачатковых класаў.

У асноўным акцэнт рабіўся на гульнявых практыкаваннях з дашкольнікамі, ролевай гульні «Мы ідзём у школу». Дзеці праз розныя віды дзейнасці, у тым ліку і выяўленчае мастацтва, адлюстроўвалі свае эмоцыі, стаўленне да школы. У межах гэтага праекта працавала «Школа першакласных бацькоў». «Мы з псіхолагам Марынай Аляксандраўнай распрацавалі план работы з імі. Дарослыя людзі вельмі цікава рэагавалі на тое, што мы ім казалі, што з імі гулялі ў вучняў. Для тых, хто мае першае дзіця, было крыху цяжкавата адчуваць сябе школьнікамі. Лягчэй было тым бацькам, у каго некалькі дзяцей. Дзякуючы гэтай школе мы зарыентавалі дарослых на тое, што яны з першакласнікамі, настаўнікам. Цікава ім было наведаць бібліятэку, сталовую і паспытаць школьныя стравы... Праект закончыцца ў канцы верасня, і тады мы прааналізуем яго, падвядзём вынікі. Магчыма, у наступным годзе спатрэбіцца яго дапоўніць, унесці нешта новае.

Гэтыя фотаздымкі зроблены ў басейне дзіцячага садка, а таксама ў пакоі для гульняў і заняткаў. Тут выхавацелі знаёмяць малых з жывёльным і раслінным светам, даюць ім першыя веды пра тэхніку, якая служыць людзям.

У астатніх педагогаў дашкольнай установы іншыя праекты. У канцы навучальнага года на педагагічным савеце робіцца прэзентацыя кожнага з іх. Настаўнікі ацэньваюць, наколькі ён удаўся, уносяць свае прапановы. Вельмі важна, што і бацькі актыўна дапамагаюць педагогам. Такая праектная дзейнасць дапамагае творча і плённа працаваць, строіць вучэбны працэс.

Напрыклад, у мінулым навучальным годзе калектыў працаваў па рэалізацыі педагагічных праектаў па бяспецы жыццядзейнасці. У межах яго ў малых фарміраваліся ўяўленні аб правілах дарожнага руху, бяспецы пры карыстанні навакольнымі прадметамі, правільныя зносіны са знаёмымі, а таксама паводзіны захавання здароўя і жыцця.

Паклапаціліся тут і пра тых малых, якія яшчэ не ходзяць у дашкольную ўстанову. Для іх стварылі адаптацыйна-развіваючую групу «Малышкіна школа», якая дапамагае не толькі дзецям, але і іх бацькам. Пра жыццё дзіцячага сада расказвае свая газета — «Бусляня».

На працягу года дашкольная ўстанова ўдзельнічала і перамагала ў разнастайных конкурсах: у раённым «Бяспечнае дзяцінства» атрымала дыплом II ступені і фотаапарат у падарунак. У раённым конкурсе «Я — даследчык» выхаванец Арцём Бортнікаў узнагароджаны дыпломам I ступені за праект «Чаму хлеб чорны, чаму белы». Хлопчык прадстаўляў Слуцкі раён на абласным конкурсе.

Па выніках 2015 года яслі-сад заняў 2-е месца ў спаборніцтве «За стварэнне аптымальных умоў для развіцця і ўдасканалення адукацыі ў Слуцкім раёне».

У час адкрыцця дзіцячага свята гандбола.

Кузня чэмпіёнаў

Менавіта так называюць Слуцкую спецыялізаваную дзіцяча-юнацкую школу алімпійскага рэзерву. Дванаццаць яе выхаванцаў уваходзяць у нацыянальную зборную Беларусі.

Школа была створана больш як 60 гадоў таму па рашэнні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта на базе спартыўнай залы Дома афіцэраў і называлася проста спартыўнай школай. Тут дзейнічала 5 аддзяленняў: баскетбол, футбол, лёгкая атлетыка, валейбол, спартыўная гімнастыка.

— Усяго з дня заснавання ўстановы падрыхтавана 5 заслужаных майстроў спорту, 11 майстроў спорту міжнароднага класа і 51 майстар спорту, — дзеліцца поспехамі дырэктар ДЗЮСШ Аляксандр Панцялееў. — На працягу многіх гадоў школа рыхтуе спартсменаў высокага класа і лічыцца адной з лепшых на Міншчыне.

У свой час яе закончылі чэмпіёны Алімпійскіх гульняў па гандболе ў Барселоне Міхаіл Якімовіч і Юрый Шаўцоў, удзельніца дзвюх Алімпіяд па лёгкай атлетыцы Таццяна Шэўчык, уладальнік найвышэйшага еўрапейскага дасягнення ў штурханні ядра і пераможца спаборніцтваў «Дружба-84» у Маскве Сяргей Краснаўскас, чэмпіёнка свету сярод юніёраў па гандболе Антаніна Чыбангу. Выпускнікі школы — прызёр IV Спартакіяды народаў СССР па плаванні, чэмпіёнка свету 1981,1982 і 1983 гадоў, пераможца міжнародных спаборніцтваў «Дружба-84» па акадэмічнай грэблі Алена Макушына, неаднаразовыя пераможцы і прызёры чэмпіянатаў свету і Еўропы, удзельнікі Алімпійскіх гульняў па сучасным пяцібор'і Анастасія Пракапенка (Пекін, Лондан) і Анастасія Мірончык-Іванова (Лондан), сярэбраны прызёр чэмпіянату свету па мастацкай гімнастыцы Вольга Маслакова, неаднаразовы пераможца і прызёр чэмпіянатаў свету і Еўропы па кікбоксінгу Вераніка Дамброўская. Гэта далёка не поўны спіс тых, кім ганарыцца Слуцк, Мінская вобласць і наша краіна.

У 1992 годзе школе нададзены статус спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву. Яна ўваходзіць у нацыянальную сістэму дзіцячых і маладзёжных спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў. Толькі з 2000 года тут падрыхтавана больш як 1000 спартсменаў масавых разрадаў, 51 кандыдат у майстры спорту, 18 майстроў спорту, 8 майстроў спорту міжнароднага класа, 1 заслужаны майстар спорту. Школа праводзіць падрыхтоўку спартсменаў па 4 відах спорту: гандбол, лёгкая атлетыка, мастацкая гімнастыка, плаванне. На 4 аддзяленнях у 63 вучэбных групах займаюцца 618 навучэнцаў. Заняткі вядуць 23 трэнеры-выкладчыкі.

У Слуцку і з футболам па-людску

Як кажуць, у Слуцку ўсё па-людску. І са спортам тут таксама поўны парадак. Ужо трэці сезон футбольная каманда «Слуцк» гуляе ў вышэйшай лізе Беларусі. Апошнім часам зборная ўмацавалася, абнавілася новымі гульцамі. Гаспадарам не сорамна цяпер прымаць гасцей на сваім, так бы мовіць, дамашнім стадыёне «Гарадскі».

Спартыўны комплекс месціцца ў гарадскім парку культуры і адпачынку, уведзены ў эксплуатацыю ў 2014 годзе. Тут з нуля пабудаваны адміністрацыйны будынак, пашырана футбольнае поле, рэканструяваны пасадачныя месцы, з'явілася новая ўсходняя трыбуна, а заходняя значна павялічылася, усе сядзенні былі заменены на новыя сіняга і белага колеру. У выніку на стадыёне адначасова можа змясціцца 1896 чалавек.

— Цяпер у нас ёсць крытая пляцоўка для відэааператара, VIP-ложа на 60 месцаў і VIP-трыбуна, — паказвае дырэктар стадыёна Генадзь Паніч. — Акрамя таго, пабудаваны аўтастаянка на 120 месцаў, а таксама паркоўка для высокіх гасцей каля адміністрацыйнага будынка. У самім будынку знаходзіцца пункт пракату канькоў, лыж, ролікаў, два тэнісныя сталы. Вельмі добрая трэнажорная зала, дзве гасцявыя і раздзявальня для футбалістаў. Наш стадыён не саступае стадыёну салігорскага «Шахцёра» і барысаўскага БАТЭ. А па некаторых пазіцыях мы нават наперадзе. У нас гуляла маладзёжная зборная Беларусі. Яе трэнер Ігар Каваленіч пахваліў наш стадыён, стан футбольнага поля.

У гэтым прыгожым будынку размешчана ўсё, што неабходна спартсменам па высокіх міжнародных стандартах.

Футбольнае поле — асаблівы гонар случчан. Яго карпатліва даглядаюць, у Германіі купляюць спецыяльную траву, рэгулярна яе падкошваюць, паліваюць, праколваюць глебу, каб кісларод паступаў да каранёвай сістэмы. На футбольным полі стадыёна «Гарадскі» спецыялісты Саюза еўрапейскіх футбольных асацыяцый бралі пробы грунту — трава пусціла карані на 15-17 сантыметраў у глыбіню. Пры тым, што нармальным лічыцца прарастанне на 12 сантыметраў. Сёлета УЕФА пасля папярэдняга інспектавання прыняла рашэнне аб правядзенні на стадыёне міжнародных спаборніцтваў. Тут ужо адбыліся міжнародныя матчы чэмпіянату Еўропы сярод дзяўчынак да 17 гадоў, міжнародны турнір.

Нагадаю, што да прывядзення спартыўнай арэны ў належны выгляд футбольная каманда «Слуцк» вымушана была праводзіць гульні ў Салігорску. У ліпені 2014 года пасля абнаўлення комплексу гараджане атрымалі магчымасць глядзець матчы любімай каманды. Ужо 5 ліпеня случчане абыгралі «Белшыну».

Жыхары Слуцка ад малога да старога любяць футбол. Здараецца, што ў дзень гульні нельга купіць білетаў — усе яны разабраны загадзя. Дзе яшчэ можна такое пабачыць?

На зялёным полі стадыёна.

Матэрыялы выпуску падрыхтавалі Алена ДАЎЖАНОК, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

■ Хто каго?

«ДА САЛІСТКІ НАШАЙ ГАЛІ ЎЧОРА ХЛОПЦЫ ПРЫЯЗДЖАЛІ...»

Што было — было. У адной вельмі інтэлігентнай сям'і дачушка расла, і бацькі з усіх сіл стараліся смачненька пакарміць яе, прыгожанька прыбраць, звазіць да мора, нечым зацікавіць — музыкай, танцамі, вязаннем, маляваннем, гімнастыкай, замежнымі мовамі, а галоўнае — за-сце-раг-чы ад рознага негатыву, а тым больш распусты: шмат куды не пускалі яе, многае не дазвалялі, самі выбіралі сяброў і сябровак. І, як здавалася, не дарэмна — усё ў іх атрымалася, 18 дачушцы! Разам адсвяткавалі. Потым яна (ужо ж дарослая!) да сябровак падалася — на гадзінку-другую. А тут ужо і трэцяя прайшла, і чацвёртая, і ноч на дварэ...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Бацькі знерваваліся, усе тэлефоны абарвалі, вочы прагледзелі! Як раптам — званок у дзверы. Адчыняюць — іх дзіця на парозе. А ўжо ж растрапанае, зацалаванае, шчаслівае...

— Дзе ты была?! — бацькі ў адзін голас. — Чым займалася?!

Дачка ім шчыра, як на споведзі:

— Я не ведаю... Але ж *гэта* будзе маім хобі на ўсё жыццё.

Спытаеце, прычым тут наш здымак? А ні пры чым — проста навеяла, як той казаў. Як **спадару Анатолю Гарачову з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна** іншы анекдот. Баба Яга каля возера сустракае Русалку. Пытае: «Мілачка, а чаму ты голая?» — «Хто вам сказаў, што голая? — з форсам адказвае тая, — на мне — эратычны касцюм». «І сапраўды, эратычны, — думае Баба. — Трэба і мне прыбрацца?» Адзелася (дакладней — раздзелася). Прыходзіць Кашчэй, пытае: «Чаму ты голая?» Баба, як тая русалка: «Гэта не галізна... Гэта касцюм такі — эратычны». «Дык нешта ж ён не прасаваны?», — кажа Бессмяротны... І тым самым падказвае **спадару Анатолю** выснову, якая лёгка можа стаць подпісам да здымка:

Зменьваць строі ды уборы
З кожным тыднем даражэй...
Таму Соні да Рыгора
Лепш хадзіць у негліжэ.

І сапраўды. А тым больш, калі ведаеш...

У Армянскага радыё спыталі, як зрабіць уражанне на жанчыну. Яно адказала: гаварыце ёй кампліменты, дарыце кветкі, вадзіце ў рэстараны, купляйце падарункі, абдымайце яе, падтрымлівайце, слухайце... Як зрабіць уражанне на мужчыну? Распраніцеся і дайце што з'есці.

З першым (маецца на ўвазе, вядома ж, не страва) гераіня верхняга здымка, можна сказаць, справілася: з адзення на ёй хіба крыха засталася. Адпаведна, усе мужчыны...

Хацелася б сказаць: «У асадак выпалі!» і «Знямелі», але ж гэта паўпраўдай будзе, бо ў асобных мужчын такі ёсць што сказаць:

Як бачым, нават у сяле
Такое ў модзе дэфіле,
Каб голы верх і босы ніз...
Стрыптыз
І ў Афрыцы стрыптыз, —

канстатуе **спадар Анатоль Гарачоў. Спадар Іван Астроўскі з Мінска** дадае:

Калі плаваннем займацца
І пры доме ёсць гарод,
Можна смела агаляцца
І фігурай выхваляцца —
Дні і ночы напралёт.

Добра, згадзіцеся, калі ёсць перад кім — выхваляцца. Асабліва па начах.

Адкуль гэтая выснова? Ды як заўжды — з канверта, і зрабіў яе **спадар Гарачоў**, якому, падобна, пашчасціла пачуць, а потым і запісаць маналог адной прыгажуні. Тая казала сваёй прыяцельцы:

Калі я жыла ў Максіма,
Мяне ветрыкам насіла...
Калі ў Яна і Адама —
Худзенькай была таксама...
Не з-за плавання з дыетай,
Усяму віною... ГЭТА:
Хочаш быць, як верабей, —
Мужыкоў мяняй часцей!

Спрэчная выснова. І можна было б пакінуць яе калі не па-за ўвагай, то без каментарыяў. Але ж ёсць адзін (у **спадара Астроўскага**). І напісаны ён не пра нейкую там абстрактную прыгажуню, а вось пра гэтую, з фота:

Файны ракурс! Ды чагосьці
Здымку яўна не стае:
Можа, дзеўцы маладосці?..
Мо цара у галаве?

А вось прыяцелькі яе, трэба разумець, «з царом»?! Бач, як хораша выглядаюць — папрыбіраліся! Ім бы музыку — дык і ў скокі пайшлі б, прычым з новай прыпеўкай (ад **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска**):

Кажуць, пень прыбяры —
Ён пахарашэе,
А бабулі падмаргні —
Дык памаладзее!

І што тады зробіць? Як мінімум, на гэтую прыпеўку адкажа сваёй (ад **спадара Гарачова**):

Прападай мае каноплі —
Узгадаю маладосць:
Выступаю сёння топлес,
Каб сагнаць на мужа злосць.

Чым канкрэтна ён жонцы не дагадзіў, ведае **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў**:

На банкет схадзіла Рада,
І цяпер сама не рада:
Муж (ну ці ж не дурнаваты?):
У чым была — адправіў з хаты!

Адзенне, трэба разумець, дома засталося?

Але ж гэта не факт, як той казаў. Бо падзеі маглі развівацца зусім паіншаму. Паводле **спадарыні Соф'і Кусянковай з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна**:

Да салісткі нашай Галі
Ўчора хлопцы прыязджалі.
І цяпер не сцяміць Гала,
Што піла і як гуляла —
Дзе сукенка?
У што абута?
Ох, і будзе ў вёсцы чутак...
Шчасце: ёсць расолу гляк!
Можа, знойдзе й андарак?

Тут дзве заўвагі дарэчы — ад **спадарыні Чыгрынавай.** Першая:

Каб раней прадрала вочы,
Прашмыгнула б ціха ўночы...
І не ведала б тады
Гэткай ганьбы і бяды.

Другая:

Во артысткі — усе, як штык...
А мастацкі кіраўнік
Без памады, не прыбрана:
«У аблом» падняцца рана...

Што ж, сустракаюцца, на жаль, такія кіраўнікі...

Але вернемся да андарака, паводле слоўніка — да паласатай альбо клятчастай спадніцы, некалі — саматканай: доўгай і цёплай, як трэба разумець, а калі яшчэ і з кішэнькамі...

Цікава, ці ёсць такія ў продажы? Варта б купіць. А потым блузку да яе — з вышыўкай, з доўгімі рукавамі... Бо гэта ж (паглядзіце на здымак) не толькі прыгожа, але яшчэ і... выгадна. Ва ўсякім разе **спадар Васіль Мірончык з Бабруйска** кожнай з дзевак-маладзіц раіць:

Прыбірайся ў вышыванку
І...
падчэпіш хлопца Янку:
Голым целам грэх свяціць,
Ды й нікога не здзівіць.

Што праўда, тое праўда: можа, таму, што прымільгалася яно — голае? «Не ведаю, як іншыя, — піша **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**, — а мне дык у памяці часы, калі песні даносіла радыё, калі папулярнасць іх залежала ад мелодыі і вершаў, ад голасу выканаўцаў. З наступленнем эры тэлебачання ўсё змянілася. Нашы спевакі і спявачкі сталі выходзіць на сцэну з падтанцоўкай, і чалавек тады часам не ведае, ці тое песню слухаць, ці на «групу падтрымкі» глядзець, бо там такія фігуры, такія... «эратычныя касцюмы».

Як трэба разумець, менавіта гэтае назіранне прадыктавала **спадару Валерыю** наступныя радкі:

Ёсць жаданне
песні пець!
Ды ў ваганнях Нюра:
Чула:
можна талент мець
І пры гэтым — «праляцець».
З дрэннаю фігурай.

А вось з добрай альбо нейкай цікавінкай, — наадварот. «Я даўно ўжо прыкмеціў, што на «Еўрабачанні» поспеху дасягаюць асобы альбо калектывы, якія дэманструюць нешта арыгінальнае, адметнае: «Буранаўскія бабулі» — свой аптымізм і непаўторныя строі, дзеўка з Аўстрыі — бараду... Дык, можа, і нашым артысткам штось падобнае «выкінуць»? — пытае **спадар Мікалай Старых з Гомеля** і нават прапануе:

Нейк з Буранава бабулі
«Еўрабачанне «абулі»:
Іх высока ацанілі,
Усёй Еўропай палюбілі...
Чым жа нашым свет здзівіць?
Можа, голую кабету
Ў падтанцоўку залічыць?

Падобныя думкі і ў **гамяльчанкі спадарыні Раісы Васільевай**:

Зараз выйсці на эстраду
Модна проста... з голым задам.
І ёсць шанцы — гэты «ўбор»
Можа выклікаць фурор!

Дык ці варта тады здзіўляцца, што

У бок эстрады робяць зрухі
І ў ансамблі «Весялухі»,
Лічаць: мала праспяваць,
Трэба й грудзі паказаць.

Пра іх яшчэ адзін анекдот дарэчы: у новага беларуса тры дзеўкі былі, думаў, з якой гэта лёс звязаць? Вырашыў кожнай даць па тысячы долараў і паглядзець, як патрацяць. Першая накупляла сабе сукенак, рознай парфумы, касметыкі... Сказала: «Калі пажэнімся, табе ўсе пазайздросцяць, бо твая жонка будзе самай стыльнай». Другая з дзяўчат усе грошы патраціла на патэнцыйнага жаніха. Сказала: «Я на цябе жыццё пакладу, ты ў мяне будзеш самым дагледжаным, самым стыльным». Трэцяя з кандыдатак у нявесты тую прапанаваную тысячу ўклала ў свой бізнес, атрымала важкі прыбытак і сказала, што разам яны горы змогуць звярнуць... Усіх халасцяк той выслухаў і такі ж ажаніўся. Каторую, спытаеце, узяў. Ды тую, у якой грудзі большыя. Бо гэта, як сведчыць **спадар Віктар Трайкоўскі з Мінска**, таксама важна:

Пры парадзе маладзіцы —
Час да клуба выпраўляцца.
Толькі Мар'ечка нудзіцца,
Бо не мае ў што прыбрацца...
— Ды не трэба табе строяў! —
Найстарэйшая тут кажа, —
Ты наш поспех, можа, ўтроіш,
Як стрыптыз усім пакажаш.

Хоць гэта здараецца і міжволі. «Неяк у канцы навучальнага года заходжу я ў клас, — успамінае **спадарыня Валянціна Гудачкова**, — а там адны дзяўчынкі. Пытаюся, дзе ж нашы хлопцы, і чую, што яны пайшлі на возера пакупацца (гэта блізка зусім), а нехта ўзяў ды іхняе адзенне схаваў». Адкуль:

Гэта шчасце — знала Каця —
У спякоту пакупацца...
Толькі хтось пажартаваў
І яе сукенку «скраў».
Дзеўкам — смех,
А голай — гора:
Правароніла уборы.

Што, вядома, не падстава для вялікага засмучэння, бо яно ж будзе горш, калі, напрыклад,

Не дай Бог убачыць Лена
Абадранае калена,
Цэлюліт і варыкоз...
А пакуль — не трэба слёз!

Вось гэтым аптымістычным заклікам ад **спадара Гарачова** і можна было б завяршыць агляд конкурснай пошты. Але ж папярэдне трэба падвесці вынікі. Такім чынам паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы найлепшыя подпісы да здымка з рупліўцам з «Брэстэнерга» («Звязда» за 10 жніўня г.г.) прыдумалі **спадарыні Любоў Чыгрынава з Мінска, Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, Галіна Пятроўская са Смаргоншчыны, Алена Кулік з Валожыншчыны, мінчане сужэнцы Астроўскія, спадары Васіль Мірончык з Бабруйска і Валерый Гаўрыш з Чавусаў**. З гэтым, апошнім меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. А таму менавіта ў Чавусы накіроўваецца прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на першы квартал наступнага года.

Вы не паспелі падпісацца на гэты? Рызыкуеце, але ж сёння ўсё яшчэ можна паправіць... Як і пачаць прыдумваць новыя подпісы да новага здымка. Поспехаў вам!

Валянціна ДОЎНАР

«ХАЙ ЗІМА БУДЗЕ ЦЁПЛАЙ!»

КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»

на IV квартал або II паўгоддзе 2016 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце ДА 11 КАСТРЫЧНІКА 2016 ГОДА ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б.Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў 14.10.2016 года будуць разыграны 7 сякер-калуноў Startul і суперпрыз — бензапіла ланцуговая Husqvarna. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.10.2016 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.12.2016 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2016 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Хай зіма будзе цёплай!» чытайце ў нумары 172 газеты «Звязда» ад 07.09.2016 г.

Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.

ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 08.09.2016 ПА 31.12.2016.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2818 ад 01.09.2016 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2016 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

на IV квартал 2016 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Вынесла дзверы, пашкодзіла аўто

Жыхарка дома па сталічным завулку Калініна паведаміла ў міліцыю пра пачуты ёй выбух. Больш за тое, у адной з кватэр вырвала дзверы і адчуваецца рэзкі пах. У гэты ж час праваахоўнікам паступіла яшчэ адно паведамленне: у мужчыны падчас выбуху пашкодзіла яго аўтамашыну «Нісан»...

Было ўстаноўлена, што гаспадар кватэры ў той дзень паехаў у вёску — на ўсе выхадныя. Перад гэтым ён перадаў ключы ад жылля свайму 56-гадоваму знаёмаму. Пасля выхадных гаспадар не паехаў дадому, а накіраваўся адразу на работу. І вось ранкам яму патэлефанаваў «кватарант», які «парадаваў» навіной. Маўляў, вырабляў у кватэры самагон і апарат выбухнуў. Прыехаўшы дадому, гаспадар заспеў у кватэры міліцыянераў, супрацоўнікаў МНС і «Мінгаза». Пра тое, што ў яго жыллі будуць вырабляць самагон, уладальнік жылля не ведаў. У адносінах да яго 56-гадовага знаёмага распачаты адміністрацыйны працэс.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ... КАЗЛОМ?

У Англіі раздалі «шнобеляў»

У Гарвардскім універсітэце дваццаць шосты раз прайшла штогадовая цырымонія ўзнагароджання Ігнобелеўскай прэміяй. Заснаваў яе ў 1991 годзе Марк Абрахамс, галоўны рэдактар і сузаснавальнік навукова-гумарыстычнага часопіса «Аналы неймаверных даследаванняў», і з таго часу цырымонія стала адной з самых чаканых падзей у навуковым календары.

Назва «Ігнобелеўская» — калька з англійскай Ig Nobel, дзе Ig — скарочанае «ignoble», гэта значыць «ганебны», «пасрэдны», на тэрыторыі былога СССР яе часцей называюць Шнобелеўскай, гэта значыць «жартоўнай Нобелеўскай». У прэміі дзесяць намінацый, частка з якіх запазычаныя з Нобелеўскай прэміі, а частка прыдумляецца па ходзе справы — у залежнасці ад таго, у якой галіне навукі за мінулы год здарыліся асабліва выдатныя «шнобелеўскія» адкрыцці. «Ігнобелеўскія» прэміі ўручаюць лаўрэаты Нобелеўскай, а сама цырымонія ўяўляе сабой нешта накшталт карнавалу з жартоўным аркестрам, опернымі спевамі, здзеклівымі дакладамі і г. д. Як і летась, кожны намінант атрымаў ва ўзнагароду 10 трлн долараў, праўда зімбабвійскіх.

Як адзначае партал nkj.ru, Ігнобелеўская прэмія нярэдка ўручаецца за вельмі сур'ёзныя, вельмі нясмешныя і вельмі лжэнавуковыя даследаванні — так, «шнобелеўку» двойчы атрымлівалі гамеапаты. У той жа час цяперашнія правілы прэміі абвяшчаюць, што яе ўручаюць «за дасягненні, якія прымушаюць спачатку засмяяцца, а потым — задумацца». Бываюць такія працы, якія выкананы па ўсіх правілах навуковага метаду, аднак сама пастаўленая ў іх праблема выглядае настолькі ва ўсіх сэнсах дзіўнай, што незразумела, як яна наогул камусьці ў галаву прыйшла. І цалкам магчыма, што, пасмяяўшыся, мы потым задумаемся — а ці няма тут і сапраўды чагосьці большага?

Бясспрэчна, галоўнай сенсацыяй гэтым разам стала першае ў гісторыі прысуджэнне Шнобелеўскай прэміі ў намінацыі «Хімія» нямецкаму аўтамабільнаму гіганту Volkswagen. Скандал, у выніку якога ўвесь свет даведаўся, як канцэрн хімічыў з выкідамі сваіх дызельных аўтамабіляў, каб тыя адпавядалі амерыканскім экалагічным стандартам, разгарэўся роўна год таму і пасля абышоўся аўтагіганту ў 14,7 млрд долараў ЗША. Цікавы быў ход інжынернай думкі інжынераў Volkswagen: калі ў машыны круціліся толькі пярэднія колы, барта-

вы камп'ютар разумеў, што машына стаіць на стэндзе, і зніжаў выкід аксіду азоту ў атмасферу. Апынуўшыся на дарозе, машына вярталася ў звычайны рэжым, не абмяжоўваючы сябе ў выкідах.

Прэмію па эканоміцы атрымала група аўтараў пад кіраўніцтвам Марка Эйвіса з Новай Зеландыі за артыкул, у якім ацэньваецца «індывідуальнасць» камянёў з пункту гледжання іх рынкавага кошту, які ўспрымаецца чалавекам.

Прэмію па медыцыне атрымалі даследчыкі з універсітэта нямецкага горада Любека. У сваім эксперыменце яны паказалі, як з дапамогай люстэрка чалавек можа суняць сверб. Пры дапамозе адмысловага раздражняльніка навукоўцы выклікалі ў добраахвотнікаў сверб на адной руцэ, пасля чаго ставілі перад імі люстэрка. Аказалася, што калі свярбіць левая рука і, гледзячы ў люстэрка, пачухаць правую, то сверб праходзіць.

Прэмія ў незвычайнай намінацыі за размнажэнне дасталася прафесару Каірскага ўніверсітэта Ахмеду Шафіку. Егіпецкі вучоны яшчэ ў 1992 годзе ў пошуках новых метадаў кантрацэпцыі прымусіў 14 мужчын падоўгу насіць спецыяльна пашытыя для іх трусы з паліэстару. На шчасце для мужчын, у іх да таго часу ўжо было ад 3 да 7 дзяцей. Па сканчэнні 12 месяцаў бесперапыннага нашэння бялізны ва ўсіх мужчын была зафіксавана адсутнасць сперматазоідаў у сперме. «Азааспермія знікла пасля зняцця падвескі, і пяць пар, якія планавалі зацяжарыць, змаглі зачаць дзіця», — прыйшоў да здавальняючых вынікаў прафесар. Раней у экспериментах егіпцяніна аналагічным пакутам падвергліся пацукі.

Прэмія міра прысуджаная канадскім даследчыкам, якія не пашкадавалі некалькіх соцень добраахвотнікаў, каб на іх вопыце даследаваць, як людзі ўспрымаюць лухту. Яны высветлілі, што людзі па-рознаму ўспрымаюць рознага роду глупства, для чаго ім спатрэбілася правесці чатыры розныя даследаванні.

Прэмію па фізіцы атрымала вялікая група навукоўцаў з Еўропы за адкрыццё і тлумачэнне таго факта, што сляпні лічаць за лепшае не звязвацца з коньмі белай масці. Нягледзячы на тое, што белыя коні часцей пакутуюць на рак скуры з-за адчувальнасці да ўльтрафіялету, яны радзей заражаюцца хваробамі, якія перадаюцца крывасысучымі насякомымі. У гэтым даследаванні навукоўцы паказалі, што сляпень арыентуецца ў пошуках ахвяры па адбітым ад валасянога покрыва палярызаваным святле. Аўтары работы прыйшлі да высновы,

што сляпні з нейкай прычыны аддаюць перавагу палярызаванаму святлу ад жывёл цёмнай масці. Прэмію падзялілі навукоўцы, якія даказалі, што з-за эфектаў палярызацыі стракозы адчуваюць імкненне да цёмных гранітных магільных пліт.

Лаўрэаты прэміі ў галіне псіхалогіі правялі апытанне 1005 чалавек ва ўзросце ад 6 да 77 гадоў, каб ацаніць, як жаданне хлусіць змяняецца з узростам. Пасля апрацоўкі вынікаў апытання аказалася, што лепшыя ашуканцы — гэта маладыя людзі і дзеці. З узростам жаданне гаварыць няпраўду значна зніжаецца. Гэта значыць, аўтары даследавання задалі пытанні тысячы лгуноў, каб зразумець, як часта тыя хлусяць.

Прэмія па літаратуры дасталася скандынаўскаму пісьменніку Фрэдэрыку С'ебергу. У сваёй трохтомнай аўтабіяграфічнай кнізе ён апісаў, як атрымлівае задавальненне ад калекцыяніравання ўжо мёртвых і збору яшчэ жывых мух.

Прэмію ў намінацыі «Успрыманне» атрымалі японскія прыродазнаўцы пад кіраўніцтвам Атсукі Хігашыямы. Іх цікавілі асаблівасці ўспрымання людзьмі адлегласці да прадмета ў і іх памераў у залежнасці ад умоў назірання. Пры гэтым іх навуковы інтарэс прыцягнула становішча, у якім чалавек нахіляецца і глядзіць на выдаленыя прадметы паміж уласных ног.

Прэмія па біялогіі прысуджаецца Чарльзу Фостэру і Томасу Туэйтсу сумесна за вельмі глыбокае пагружэнне ў свае даследаванні. Першы жыў на прыродзе як просты барсук, выдра, алень і ліс. Чарльзу нават неяк удалося пабыць у ролі птушкі. Аднак Томас Туэйтс вырашыў пайсці далей за свайго калегу. Ён у літаральным сэнсе вырашыў стаць казлом. Туэйтс замовіў сабе пратэзы, якія імітуюць казліныя капыты, і адправіўся ў швейцарскія Альпы. У якасці абароны галавы Томас выкарыстаў абцякальны веласіпедны шлем. Правёўшы тры дні сярод рагатых жывёл, Туэйтс многае даведаўся пра казліныя звычкі і жыццё на высакагор'і.

Як адзначае gazeta.ru, для тых, хто не зразумеў сэнсу або пастаноўкі эксперымента, па правілах шнобелеўскага камітэта ладзяцца лекцыі ў Масачусецкім тэхналагічным інстытуце, у ходзе якіх «шнабеліяты» раскажуць аб сваіх адкрыццях.

■ Даследаванні

ГАЛАНДЦЫ СПЯЦЬ БОЛЬШ ЗА ЎСІХ

Вызначаны самыя санлівыя нацыі свету

Больш за ўсё сярод народаў свету спяць галандцы, а менш за ўсё часу ў ложку праводзяць жыхары Японіі і Сінгапура. Да такой высновы прыйшлі навукоўцы, якія даследавалі стаўленне да сну ў прадстаўнікоў 100 краін свету. Свае высновы яны прадставілі ў часопісе Science Advances.

Матэматыкі з Універсітэта штата Мічыган атрымалі інфармацыю пра асаблівасці сну некалькіх тысяч чалавек дзякуючы бясплатнай мабільнай праграме па барацьбе з джэт-лагам — Entrain. Пасля яе запуску ў 2014 годзе каля васьмі працэнтаў карыстальнікаў пагадзіліся (на ўмовах ананімнасці) падзяліцца з навукоўцамі інфармацыяй аб працягласці свайго сну. Спецыфічнасць выбаркі, папярэджваюць навукоўцы, не дае падставы меркаваць пра большасць насельніцтва па атрыманых такім чынам звестках.

Перш за ўсё даследчыкі высветлілі, што час адыходу да сну вызначаецца сацыяльнымі фактарамі — неабходнасцю доўга працаваць або вячэрнімі забаўкамі. Аднак будзіць людзей раніцай перш за ўсё ўнутраны біялагічны гадзіннік. Такім чынам, позняе засынанне непазбежна гарантуе дэпрывацыю сну.

Акрамя таго, высветлілася, што жанчыны ў сярэднім спяць на 30 хвілін даўжэй за мужчын. Яны раней кладуцца і пазней устаюць. Найбольш ярка гэтая тэндэнцыя праяўляецца ва ўзросце 30—60 гадоў. Мужчыны сярэдняга ўзросту звычайна пазбаўлены паўнавартаснага сну — яны вельмі часта спяць менш за належныя 7-8 гадзін. Дапамагае выспацца, як высветлілася, натуральнае асвятленне.

Нарэшце, навукоўцы даведаліся аб важнай ролі ўзросту ў вызначэнні часу сну. Чым старэйшымі становяцца людзі, тым раней яны кладуцца спаць. Пасля 55 гадоў роскід у звычках, якія датычацца сну, становіцца значна меншым (усе кладуцца і ўстаюць прыкладна ў адзін і той жа час). На думку даследчыкаў, гэта звязана з магчымасцямі біялагічных гадзіннікаў, якія звужаюцца.

Што тычыцца нацыянальных асаблівасцяў, то больш за ўсё спяць жыхары Нідэрландаў (у сярэднім 8 гадзін 12 хвілін) — гэта на 45 хвілін даўжэй, чым у японцаў і сінгапурцаў (7 гадзін 24 хвіліны).



■ Прадметная гісторыя

Працягваем знаёміцца з цікавымі і незвычайнымі рэчамі з нашага мінулага.

Пярсцёнак-ахоўнік. У віктарыянскую эпоху, калі якасць і колькасць асвятлення на вуліцах буйных гарадоў пакідала жадаць лепшага, злачынствы на вуліцах былі звычайнай справай. Таму для абароны свайго жыцця людзі прыдумлялі разнастайныя прылады. З дапамогай дзвюх маленькіх кнопак у пярсцёнку адкідвалася вострае лязо — і перавага ў вулічнай барацьбе тут жа пераходзіла на бок яго ўладальніка

КАГО ВІКІНГІ БРАЛІ З САБОЙ У ПАХОД

Так склалася, што нашы ранейшыя ўяўленні пра вікінгаў як пра адзінокіх, суровых рабаўнікоў і налётчыкаў крыху не адпавядаюць рэчаіснасці. Яны, канешне, былі суровымі і ўжо дакладна не цураліся рабаванняў, але ад адзіноты ў сваіх далёкіх паходах не пакутавалі. Не так даўно высветлілася, напрыклад, што ў марскія паходы з імі адпраўляліся жонкі. І імі аднымі справа не абмяжоўвалася — новае даследаванне паказала, што скандынавы бралі з сабой яшчэ і катоў.

Даследчыкі з парыжскага Інстытута Жака Мона прааналізавалі ДНК 290 катоў з 30 археалагічных помнікаў, якія былі раскіданыя па розных кутках планеты: Еўропе, Блізкім Усходзе і Афрыцы. Часавы роскід рэшткаў таксама быў шырокі: ад каменнага веку (каля 9 тыс. гадоў таму) да Новага часу (XVIII ст.). Як і варта было чакаць, сяброўскія адносіны людзей і катоў пачаліся са з'яўленнем земляробства. Як толькі чалавек пачаў вырабляць і захоўваць лішкі збожжа, побач з ім адразу ж з'явіліся мышы, а за імі прыйшлі і каты. Так што хвастатыя ахоўнікі спачатку распаўсюджваліся па свеце ўслед за матыкамі і сярпамі.

Другая хваля распаўсюджвання коцікаў па айкумене пачалася на некалькі тысячагоддзяў пазней. Яе эпіцэнтрам стаў Егіпет, адкуль лаўцы мышэй досыць хутка дасягнулі далёкіх куткоў Афрыкі, Азіі і Еўропы. Генетычныя маркеры кошак-егіпцянак знайшліся ў іх «сваякоў» з Балгарыі, Турцыі і паўднёвай часткі Афрыкі. Верагодна, галоўнай функцыяй хвастатых мараплаўцаў, якія складалі кампанію вікінгам, таксама была барацьба з мышамі. Магчыма, вікінгам наогул было больш прыемна падарожнічаць з катамі, чым без іх.

Пра тое, што вікінгі добра ведалі, хто такія кошкі, сведчыць не толькі генетыка. Так, каціныя астанкі былі знойдзены ў пахаванні скандынава ў паўночнай Германіі. А ў калекцыі дацкага Музея натуральнай гісторыі ёсць прадметы адзення вікінгаў, зробленыя з каціных шкур. Мяркуючы па іх памерах, гэта былі свойскія жывёлы. Дакладна вядома, што вусатыя і паласатыя дабраліся да Грэнландыі ўжо ў раннім Сярэднявеччы. Інакш, як на борце дракара, яны туды патрапіць не маглі. Акрамя таго, каты часта фігуруюць у скандынаўскай міфалогіі: яны цягнуць на сабе каляснiцу багіні кахання Фрэй *(гл. малюнак)*, а ў Локі з Утгарда быў настолькі вялікі кот, што яго не мог падняць сам Тор.

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. *hvir@zviazda.by*

■ За падзеяй

І ФІЗІК, І ЛІРЫК

Сын Якуба Коласа прадставіў выстаўку фотаздымкаў

У межах экспазіцыі «Мілыя вобразы», што да 15 кастрычніка працуе ў Літаратурным музеі Янкі Купалы, можна пабачыць партрэты вядомых пісьменнікаў — Якуба Коласа, Янкі Маўра, Міхася Лынькова, Максіма Танка, замалёўкі з іх сямейнага жыцця, фотаздымкі вясковых краявідаў і гарадскіх вуліц... Кожная з работ Міхася Канстанцінавіча выклікае згадкі ў яго памяці, ён распавядае вясёлыя і сумныя гісторыі, звязаныя з гэтымі фота.

Міхась МІЦКЕВІЧ прадстаўляе выстаўку «Мілыя вобразы».

Новая фотавыстаўка — ужо трэцяя ў творчым лёсе майстра. Першая прайшла ў Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа, другая — у Мар'інагорскай карцінной галерэі. На выстаўцы прадстаўлена толькі частка багатага фотаархіва Міхася Міцкевіча. Майстар валодае сапраўдным дарам убачыць, схапіць і зафіксаваць хуткаплыннае імгненне, зрабіць яго жывым і цёплым, блізкім да нас. Многія фотаздымкі маюць дасціпныя назвы, часам іх суправаджаюць і эпіграмы, складзеныя самім фотамастаком.

Асоба Міхася Міцкевіча — прыклад спалучэння розных талентаў. Ён — доктар тэхнічных навук, яго аўтарству належаць больш як 250 навуковых работ, звыш 20 вынаходніцтваў. Праявіў сябе і ў спорце. Майстар спорту па стэндавай стральбе, прызёр адной з першых спартакіяд народаў СССР. Адно з яго хобі — паляванне. Таксама Міхась Канстанцінавіч выдатна валодае словам. Ён аўтар успамінаў «Пад бацькоўскім дахам», «Слова пра Юрку, Коласава сына». Але здаецца, што менавіта фотамастацтва стала тым звяном, што паяднала рысы фізіка і лірыка.

— Неяк я праходзіў практыку ў лабараторыі электрафізікі, дзе мне вельмі дапамагаў у рабоце вядомы оптык Барыс Бойка, ён стаў пазней акадэмікам, — расказвае Міхась Міцкевіч пра вытокі свайго захаплення. — Барыс Барысавіч мне шмат дапамог у разуменні працэсу фотаздымкі, апрацоўкі фота. Мне многа гадоў даводзілася афармляць справаздачы, здымаць дэталі, чарцяжы. Дзякуючы гэтай рабоце, а таксама выдатнай тэхніцы, якая была ў лабараторыі, — тут я карыстаўся высакахуткаснай камерай — змог развіваць захапленне.

Міхась Канстанцінавіч ахвотна дзеліцца ўспамінамі пра занакавыя моманты, якія ён захаваў на фотаздымках. Расказвае і пра здымкі, якія былі ў задумцы, але, на жаль, так і не былі зробленыя:

— Мне добра запомніўся прыезд Купалы да Коласа ў Падбярэжжа, дзе мы праводзілі лета 1936 года. Купала прыехаў з цёткай Уладзяй. Пакуль жанчыны купаліся ў Свіслачы, Купала з Коласам за добрай гамонкай пілі каньяк. Ужо пад вечар пайшлі лавіць рыбу. Закінулі вуды, дзядзька Янка злавіў некалькі акунькоў, а Колас вывудзіў язя мо з кілаграм вагой, а потым і яшчэ адну рыбіну грам на 800. Мне даручылі несці рыбу ў дом. Ужо пазней, памятаючы тое выдатнае лета, я вярнуўся ў Падбярэжжа, хацеў сфатаграфаваць і той дуб на беразе рэчкі, пад якім сядзеў Купала, і паварот ракі. Але на тым месцы ўжо не было дрэва: рака выпрастала рэчышча і знесла дрэва.

Цікава, што на фотавыстаўцы «Мілыя вобразы» можна пабачыць не толькі самі здымкі. Тут прадастаўлена і фотатэхніка Міхася Міцкевіча, тыя фотаапараты, з дапамогай якіх былі зроблены гэтыя знакавыя работы.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Бачылі?

ШАГАЛ І... ХАДУЛІ

Унікальны праект «Лялечны квартал» міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» плануецца падняць на новую вышыню. А ў «Беларускім тэатры «Лялька» пакуль рыхтуюць сюрпрызы для чарговага сезона. Тут актыўна выкарыстоўваюць сучасныя тэхналогіі ў кантактах з гледачамі.

— «Лялечны квартал» добра ацэнены дырэкцыяй фестывалю і публікай. За тры гады ён стаў адным з самых цікавых на «базары». Сёлета дзеці і дарослыя пабачылі нашы спектаклі, а таксама работы Палтаўскага акадэмічнага тэатра лялек, тэатра з Маскоўскай вобласці «Крэсіва», Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта тэатра, кіно і тэлебачання. Выступіў і Маскоўскі тэатр «Адлюстраванне». Вельмі хочацца, каб на «Славянскі базар» прыехалі і з іншых славянскіх дзяржаў. Гатовы запрасіць калег з Польшчы, Сербіі, Балгарыі і гэтак далей, — сказаў **Віктар КЛІМЧУК, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, мастацкі кіраўнік «Лялькі»**.

У нядзелю, 18 верасня тэатр распачаў чарговы сезон. У гэты дзень дзецям паказалі спектакль «Папялушка, або Хрустальныя чаравічкі» (рэжысёр Віктар Клімчук). А дарослых гледачоў запрасілі на пастаноўку «Загубленая душа, або Пакаранне грэшніка» паводле твораў Яна Баршчэўскага (рэжысёр — Алег Жугжда). Каля будынка тэатра правялі майстар-класы па скрапбукінгу, вырабе цацачных мядзведзікаў Тэдзі, арыгінальнага тэкстылю, упрыгажэнняў з медзі і каменю.

— Магчымасць набываць квіткі праз інтэрнэт становіцца вельмі папулярнай. Паралельна мы актывізавалі працу ў сацыяльных сетках. Стварылі спецыяльныя групы, праводзім апытанні, — расказвае **Аляксандр ГРЫГОР'ЕЎ, дырэктар тэатра**.

Каб заўсёды здзіўляць, у тэатры рэалізуюць розныя ідэі. Напрыклад, тут ёсць група артыстаў, якія працуюць... на хадулях. Аўтар канцэпцыі — актрыса вышэйшай катэгорыі Дар'я Зімніцкая. Яна ж і рэжысёрка вулічнага спектакля «Шагал. Выход», падчас якога артысты на хадулях працуюць з лялькамі розных сістэм кіравання.

У планах — узяць удзел у ІІ міжнародным фестывалі тэатраў лялек «Шомбай-fest» у Казані.

Аляксандр ПУКШАНСКІ .
pukshanski@zviazda.by

Падчас спектакля «Лялькі» «Загубленая душа».

■ Экслібрыс «Звязды»

КАНДРАТ КРАПІВА, ДОКТАР МЕДЫЦЫНЫ

Кандрат Крапіва. На вастрыі: п'есы, апавяданні, вершы і байкі. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2016. — 383 с.

Яшчэ са школьнай праграмы па літаратуры многія з нас памятаюць трапныя выслоўі з баек К. Крапівы. «Каб сонца засланіць — вушэй асліных мала», «Другі Баран — ні «бэ», ні «мя», а любіць гучнае імя», «Да славы прагныя, ды вузкія ў плячах» — гэтыя і іншыя выразы, што сталі крылатымі, трывала ўвайшлі ў нашу мову. Не дзіўна таксама, што байкі Кандрата Крапівы ўжо шмат дзесяцігоддзяў застаюцца пэўнага кшталту «хітамі» школьных спісаў вершаў для завучвання на памяць. Яны смешныя, дасціпныя і лёгка запамінаюцца. Натуральна, іх можна знайсці і ў новым зборніку твораў класіка.



Не абышлі ўвагай укладальнікі (дарэчы, разам з галоўным рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктарам Шніпам над гэтай кнігай працавала і ўнучка Крапівы Алена Атраховіч) і папулярныя п'есы класіка, якія таксама ўжо складаюць залаты фонд нашай драматургіі. Гэта «Хто смяецца апошнім», «Мілы чалавек», «Брама неўміручасці». Але ёсць тут і тэксты, што раней былі досыць рэдкімі. Яны нам адкрываюць невядомыя рысы творчай індывідуальнасці Крапівы.

Гэта, напрыклад, п'еса, якая і дала назву ўсёй кнізе, — «На вастрыі». Яна — на незвычайную і нават крыху нечаканую для спадчыны аўтара тэму медыцыны. Сам пісьменнік жыццё сістэмы аховы здароўя, адметнасці характараў урачоў ды малодшага медперсаналу ведаў добра. Справа ў тым, што п'еса пісалася, калі творца быў у досыць сталым узросце. Яна датуецца 1982 годам, аўтару ў той час было ўжо больш чым 85 гадоў. Крапіва часта ляжаў у шпіталі, а дома пра яго асабліва пільна клапацілася і даглядала нявестка Зоя, урач па прафесіі. Дарэчы, Зоя стала прататыпам адной з гераінь п'есы «На вастрыі», удзячны Крапіва ёй тут адвёў значную ролю палатнай медсястры, нават імя пакінуў нязменным, надзяліў яе неверагоднай уважлівасцю і чуллівасцю ў стаўленні да пацыентаў.

У ліку герояў гэтай п'есы Кандрата Крапівы — не адзін доктар. Іх тут — цэлае хірургічнае аддзяленне на чале з загадчыкам Мікалаем Ракітным і яго памочнікам Алегам Якаўцом. Але ж у цэнтры ўвагі аўтара і чытача апынаюцца пытанні не зусім медыцынскія. Хутчэй жыццёвыя, этычныя. Як заўсёды ў творчасці гэтага драматурга, мы маем справу не проста з героямі, але з пэўнымі характарамі, тыпамі людзей. Вось таленавіты і адораны хірург Віктар Галубовіч, чалавек сумленны, шчыры і адкрыты. Яго калега Барыс Грушэўскі, які час ад часу можа і «схалтурыць». А вось — крыху «слізкі» памочнік «шэфа» Алег Якавец, да якога сыходзіць... жонка Галубовіча, крыху ветраная і павярхоўная Галіна. Лёс складваецца так, што праз некаторы час, калі сардэчныя раны ўжо мусяць амаль загаіцца, Якавец трапляе ў сваё ж аддзяленне, але ўжо ў ролі пацыента з моцна запушчанай язвай ці апендыцытам (урачам яшчэ трэба паставіць правільны дыягназ); яго жыццю пагражае небяспека, лёс залежыць ад майстэрства хірурга. Натуральна, і былая жонка, і загадчык аддзялення такую складаную і жыццёва важную аперацыю ўскладаюць на плечы самага таленавітага ўрача — у былым падманутага мужа Віктара Галубовіча.

Як бачым, страсці тут сапраўды кіпяць, а героі звязаныя паміж сабой яшчэ больш цеснымі повязямі, чым у бразільскіх серыялах. Крапіва ўмее ліха закруціць сюжэт, ды і да расчаравання чытача, фінал пакідае амаль адкрытым. А яшчэ ён паказвае, што людзям прасцей прытрымлівацца кепскай думкі нават пра самага праўдзівага чалавека, таленавітага ўрача, чым прыняць яго высакароднасць і абсалютную непрадузятасць у справе лячэння людзей. На вялікі жаль, хворага Якаўца ўратаваць не ўдалося... Але ці ўдасца наладзіць сямейнае жыццё Галубовічу? А вось на гэтае пытанне драматург нам не дае пэўнага адказу.

Дарэчы, асобныя рысы творчага почырку Крапівы ярка праяўляюцца і ў апавяданнях, што ўвайшлі ў новы зборнік. Гэта, напрыклад, уменне расстаўляць акцэнты і звяртаць увагу на пазітыўныя моманты, народны, натуральны для беларусаў гумар і неверагодная назіральнасць. Здаецца, ніводная дэталь не застанецца без увагі аўтара, будзе дакладна акрэслена і пастаўлена на сваё месца ў агульнай нітцы расповеду. Думаецца, менавіта за гэтыя рысы Кандрат Крапіва і палюбіўся многім пакаленням беларускіх чытачоў.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

ПРИГЛАШЕНИЕ

Унитарное предприятие Национального олимпийского комитета Республики Беларусь
Спортивно-оздоровительный комплекс «ОЛИМПИЙСКИЙ»

ПРОВОДИТ АУКЦИОН №110 ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИЗОЛИРОВАННОГО НЕЖИЛОГО ПОМЕЩЕНИЯ СРОКОМ НА ТРИ ГОДА

	Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения	Площадь, м²	Начальная цена продажи до деноминации	Начальная цена продажи после деноминации
	г. Минск, ул. Сурганова, 2			
1	Изолированное нежилое помещение № 47 на 1 этаже (под офис)	12,7	431 800	43,18
	г. Минск, ул. Сурганова, 2			
2	Изолированное нежилое помещение № 55 на 1 этаже (под офис)	19,0	646 000	64,60

Аукцион состоится «31» октября 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по «28» октября 2016 года до 16.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.

Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок: (017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11.

Интернет: www.dvs.by.

Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на **расчетный счет 3012208250015, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, МФО 153001964, УНП 101 508 270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 31 октября 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома

Номер лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке зем. документации	Сумма задатка, бел. руб.
Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома						
1	Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Корбачевка, земельный участок У-11, кадастровый номер 623280403601000073, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,1354	Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги	7 200,00	1 537,75	720,00
2	Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Дубница, земельного участка У-5, кадастровый номер 623280402601000053, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,1107	Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги	4 700,00	1 363,72	470,00
3	Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Корбачевка, земельный участок У-12, кадастровый номер 623280403601000074, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,1354	Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги	7 200,00	1 549,99	720,00

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № 3600619011121 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 795, код платежа 4901, УНН 600181549, получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.

Аукцион состоится 31 октября 2016 года в 10.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.

Последний день приема заявлений – **25 октября 2016 года до 17.00.**

Контактные телефоны: **(801774) 58445, 58435, 58436.**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 127 31 октября 2016 года

Вид аукциона открытый	Лот № 1	Лот № 2	Лот № 3
